Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 150 (28260)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ад стажора — да прафесара асветы

СТАР. 6

Чым здзівіць «Тэарт»?

СТАР. 8

Уга Чавес ва ўспамінах беларусаў

СТАР. 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва

«Запусціць сістэму будаўнічых зберажэнняў няпроста, бо трэба прадугледжваць бюджэтныя сродкі, каб плаціць прэміяльныя тым, хто на доўгія тэрміны будзе рабіць уклады. Цяпер пытанне ў стадыі прапрацоўкі. Каб гэта пачало працаваць, трэба мець больш нізкі працэнт інфляцыі і стаўкі рэфінансавання. Калі мы ідзём на адназначную лічбу інфляцыі, то гэты інструмент рабочы. Пры гэтым падкрэслю, што скарыстацца такім інструментам змогуць не толькі грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.08.2016 г.

Долар ЗША	1,9777	▼
Еўра	2,2053	▼
Рас. руб.	0,0302	▲
Укр. грыўня	0,0796	▼

ISSN 1990 - 763X

ТУРСКІ ХЛЕБ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адной з першых у Рагачоўскім раёне завяршае жніво Турская сортавыпрабавальная станцыя (вёска Турск), якая спецыялізуецца на вырошчванні элітных айчынных і замежных сартоў збожжавых культур на насенне. Лепшы ўдзельнік сёлетняга жніва гэтага прадпрыемства — механізатар са шматгадовым стажам Уладзімір САВІЦКІ, а яно — жніво — у яго дваццатае. На камбайне «Палессе 12» майстар хлебаробскай справы са сваім памочнікам Уладзімірам Кавалёвым намалочвае за дзень па 80-100 тон збожжа. У гонар экіпажа на мехдвары гаспадаркі часта паднімаўся сцяг пераможцаў.

А малады дырэктар Турскай сортавыпрабавальнай станцыі Аляксандр ХАРЫТОНЕНКА ў час адказнай і гарачай кампаніі ўвогуле заўсёды знаходзіўся на жніўным полі. Хлебаробы станцыі на 450 гектарах сабралі больш як тысячу семсот тон збожжа.

■ Браты нашы меншыя

НУМАР «ЛЮКС» ДЛЯ БАРСІКА

Ці карыстаюцца попытам сталічныя гасцініцы для жывёл?

Калі гаспадары катоў і сабак збіраюцца ў паездку, у іх заўсёды ўзнікае пытанне: з кім пакінуць гадаванца? Звычайна догляд спрабуюць даручыць суседзям ці сваякам. Больш сучасны варыянт — звярнуцца ў гасцініцу для жывёл. У сталіцы, напрыклад, працуе з дзясятак такіх гатэляў. У якія нумары засяляюць катоў і сабак? Колькі каштуе пражыванне ў гасцініцах? І якім хочуць бачыць сэрвіс гаспадары жывёл?

140 рублёў за тыдзень

У гасцінічных нумарах для жывёл няма тэлевізараў і электрачайнікаў. Звычайна гэта невялікія асобныя вальеры з мінімумам мэблі ці без яе. Пастаяльцам абяцаюць двух-трохразовае харчаванне і прагулкі раніцай, днём і ўвечары. Корм просяць прывозіць свой, але па жаданні гатовы прыгатаваць вашаму любімцу нават дамашнюю ежу. Суткі ў гатэлі ў сярэднім каштуюць 20-30 рублёў.

За даплату могуць таксама падстрыгчы вашага гадаванца, арганізаваць дрэсіроўку ці візіт да ветэрынара. Калі не маеце ўласнага аўто і не хочаце дабірацца з катом ці сабакам на грамадскім транспарце, гатэль забяспечыць вас зоатаксі.

СТАР. 5

■ Алімпійскі дзённік

ПОЗІРК У ГІСТОРЫЮ

Пра самыя цікавыя факты першых Алімпіяд

Гульні ў Бразіліі ўжо стартавалі, прайшла ўрачыстая цырымонія адкрыцця, а значыць, алімпійскі агонь запалены і спартсмены гатовыя ўступіць у барацьбу. Спаборніцкая праграма Алімпіяды была адкрыта мужчынскім футбольным турнірам учора і працягнецца ўжо сёння. У суботу самы час «уключацца» ў Гульні і беларускім аматарам спорту, таму што свае выступленні ў Рыа пачынаюць прадстаўнікі нашай краіны.

СТАР. 4

Першым у складзе беларускай каманды на старт Гульняў выйшаў Антон ПРЫЛЕПАЎ (стральба з лука).

■ Чацвёртая ўлада

РАСКАЗВАЦЬ АБ СТАНОЎЧЫМ ВОПЫЦЕ І РАЗБІРАЦЦА Ў ПРАБЛЕМНЫХ ПЫТАННЯХ

Місію журналістыкі абмеркавалі на рэспубліканскім семінары ў Гродне

Каля 200 журналістаў з усіх абласцей сабраў учора на Гродзеншчыне рэспубліканскі семінар «Аб рабоце СМІ па рэалізацыі задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі». Яны пазнаёміліся з творчымі напрацоўкамі «Гродзенскай праўды», Лідскага тэлерадыёаб'яднання, ваўкавыскай газеты «Наш час», медыякомплексу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, пабывалі на шэрагу прадпрыемстваў, арганізацый вытворчай і сацыяльнай сферы, паўдзельнічалі ў запуску на тэлеканале «Гродна плюс» вяшчання ў HD-фармаце на пастаяннай аснове.

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ падкрэсліла знакавасць таго, што семінар праходзіць у кантэксце нядаўняга Усебеларускага народнага сходу і напярэдадні выбараў у парламент:

— Важна, каб тыя пасылы, задачы, якія пастаўлены Усебеларускім народным сходам, трансфармаваліся на старонках газет, у эфіры тэлерадыёканалаў, на інтэрнэт-рэсурсах, на растлумачэнне дзяржаўнай палітыкі. Бо самае галоўнае — гэта фарміраванне адказных адносін грамадзян да сябе, сваёй сям'і, краіны.

Што тычыцца выбараў у парламент, то трэба ўважліва і вельмі адказна кіравацца патрабаваннямі выбарчага заканадаўства.

— Упэўнена ў тым, што СМІ ў поўным аб'ёме выканаюць сваю задачу па ўсебаковым, аб'ектыўным інфармаванні аб выбарчым працэсе, каб грамадзяне мелі магчымасць азнаёміцца з праграмамі кандыдатаў у дэпутаты і зрабілі дастойны выбар, — дадала міністр.

Лілія Ананіч пакрэсліла, што задача медыйнай сферы ва ўмовах канкурэнцыі — узмацняць стварэнне нацыянальнага кантэнту, бо ніхто лепш за нас саміх не раскажа пра тое, што адбываецца ў нашай краіне. Вельмі шмат добрых тэм, праектаў, якія патрабуюць пільнай увагі журналістаў, напрыклад пытанні здаровага ладу жыцця. Канешне, у цэнтры ўвагі прэсы павінны заставацца важнейшыя праблемы развіцця эканомікі, сацыяльнай палітыкі. Пры гэтым, расказваючы аб станоўчым вопыце, які маецца ў кожным рэгіёне, трэба бачыць і не ўтойваць вострыя тэмы, якія хвалююць насельніцтва, і разам з чытачамі, уладай разбірацца ў праблемных пытаннях. Тым больш што толькі ў нашай краіне ёсць указ Прэзідэнта аб рэагаванні на крытычныя выступленні ў СМІ.

Лілія Ананіч таксама звярнула ўвагу на ўдасканаленне работы ў інтэрнэце. Інтэрнэт-сайты створаны, але трэба, каб гэтыя рэсурсы былі запатрабаваны чытачамі. Неабходна больш актыўна працаваць у сацыяльных сетках, з парталам «БелСМІ».

— Моцна трымацца на лідарскіх пазіцыях сёння, у эпоху хуткага развіцця новых тэхналогій, можа толькі добра аснашчаная і забяспечаная высокапрафесійнымі кадрамі рэдакцыя сродку масавай інфармацыі, — лічыць **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Фота БЕЛТА.

Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.

У мінулай пяцігодцы на Гродзеншчыне рэалізавалі абласную Комплексную праграму развіцця сродкаў масавай інфармацыі, дзякуючы якой значна ўмацавалі матэрыяльную базу рэдакцый газет і друкарняў. А дзеля эфектыўнага выкарыстання творчага патэнцыялу нядаўна стварылі рэгіянальны кластар друкаваных СМІ, у які ўвайшлі рэдакцыі «Гродзенскай праўды», раённых газет, абласное аддзяленне Беларускага саюза журналістаў, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы і галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. У рамках гэтай медыйнай структуры ладзяць творчыя семінары, трэнінгі, арганізавалі конкурс інавацыйных праектаў студэнтаў і маладых спецыялістаў у сферы медыякамунікацый.

Безумоўным прыярытэтам сёння з'яўляецца і якасная работа ў інтэрнэце. Віктар Лісковіч паведаміў, што ў рэгіёне ствараюць свайго роду вертыкаль дзяржаўных электронных рэсурсаў, якая ўключае сайты прадпрыемстваў і арганізацый, СМІ, органаў улады. Інфармацыя распаўсюджваецца ад сайтаў выканкамаў да самых невялікіх прадпрыемстваў, і, наадварот, навіны з месцаў аператыўна даходзяць да буйных інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў. Пры гэтым з'явіліся клікабельныя банеры рознай тэматыкі. Любы наведвальнік сайта сёння абавязкова ўбачыць блок навін, можа адкрыць банеры «Выбары-2016», «Год культуры», «Гродзенская вобласць. Каляндар падзей — 2016», «Легенды Гродзеншчыны», а таксама тыя, якія падкажуць, як актыўна і з карысцю правесці вольны час, — «Веларух», «Каробчыцкі «Алімп», «Турыстычная прывабнасць Гродзеншчыны», «Аўгустоўскі канал запрашае».

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

У тэму:

Сяргей РАЎНЕЙКА, памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці:

— Думаю, што СМІ маюць важнейшае значэнне ў сістэме дзяржаўнага кіравання, паколькі гэта, па-першае, вельмі дзейсны сродак уплыву, а па-другое, эфектыўны канал данясення аператыўнай інфармацыі. Хацелася б, каб СМІ былі ў рэгіёне дыскусійнай пляцоўкай, дзе ўзнімаюцца надзённыя пытанні і даецца магчымасць выказацца ўсім слаям насельніцтва, у тым ліку аказваючы ўплыў на прыняцце рашэнняў уладамі.

НА ВАРЦЕ ФІНАНСАВАЙ БЯСПЕКІ

У апошнія гады органы фінансавых расследаванняў дзяржаўнага кантролю (ОФР) займаліся процідзеяннем ілжэпрадпрымальніцтву, ухіленню ад выплаты падаткаў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама крымінальнаму банкруцтву. Так, у першым паўгоддзі сёлета ОФР выявілі каля тысячы злачынстваў, з іх больш за траціну адносяцца да катэгорыі цяжкіх. Акрамя таго, аператыўнікі спынілі дзейнасць 11 злачынных груп. У выніку дзеянняў фінансавай міліцыі ў бюджэт паступіла 989 мільярдаў недэнамінаваных рублёў.

На асаблівых падставах

«Фактычна ўсе праверкі органаў КДК — выніковыя,— адзначыў падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў Ігар МАРШАЛАЎ**. — На кожны рубель, запланаваны на фінансаванне ОФР у 2016 годзе, ужо па выніках першага паўгоддзя забяспечана паступленне ў бюджэт больш чым 7 рублёў». Пры гэтым удзельная вага праверак, якія праводзяцца ўсімі падраздзяленнямі КДК, складае ўсяго 1,5% ад агульнай колькасці планавых і пазапланавых праверак, якія праводзяцца па краіне ўсімі астатнімі кантрольнымі і наглядным органамі. Адсюль выснова — ОФР працуюць толькі кропкава, калі маюць на тое асаблівыя падставы.

Выпраўленне крэдытнай гісторыі

Па словах Ігара Маршалава, у сферы пагашэння крэдыторскай запазычанасці адзначаецца пагаршэнне крымінальнай абстаноўкі. У першым паўгоддзі ўзрасла больш чым у два разы, у параўнанні з аналагічным перыядам летась, колькасць выяўленых злачынстваў па фактах ухілення ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці, а таксама ад выканання судовых пастаноў па эканамічных справах. За першае паўгоддзе ОФР выявілі больш за 300 парушэнняў, звязаных з выплатай даўгоў, уключаючы 173 злачынствы па ўхіленні ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці. Таксама Ігар Маршалаў адзначыў, што расце і колькасць злачынстваў, звязаных з атрыманнем крэдытаў.

Лекі ад ілжэпрадпрымальніцтва

Супрацьдзеянне лжэпрадпрымальніцтву застаецца ў ліку галоўных прыярытэтаў дзейнасці ОФР. Так, у першым паўгоддзі спынена дзейнасць сямі злачынных груп, якія арганізавалі рэгістрацыю і функцыянаванне 308 ілжэструктур, а таксама выяўлена 230 злачынстваў, учыненых з іх выкарыстаннем. Па артыкуле 234 (ілжэпрадпрымальніцтва) Крымінальнага кодэкса выяўлена 18 правапарушэнняў. Такім структурам і іх контрагентам прад'яўлена да выплаты дадатковых плацяжоў на агульную суму ў 961 мільярд рублёў без уліку дэнамінацыі, з якіх у бюджэт спагнана 753 мільярды рублёў.

«Апошнія затрыманні сведчаць аб тым, што лжэструктуры ў асноўным рэгіструюцца за межамі Беларусі. У выніку іх кліенты нясуць дадатковыя выдаткі, што не кожны бізнес можа сабе дазволіць. Часам прасцей заплаціць у бюджэт падаткі, чым губляць сродкі потым, — сказаў Ігар Маршалаў. — Разам з тым у буйных ілжэструктур выяўляецца да 1 тысячы контрагентаў, што сведчыць пра тое, што гэта злачынная з'ява існуе, хоць і не ў такіх маштабах, як раней».

Рэгістрацыя лжэструктур за межамі краіны некалькі ўскладняе працэс дакументавання, але дзякуючы міжнароднаму супрацоўніцтву ОФР паспяхова дамагаюцца пэўных вынікаў.

Разам з тым, па словах **начальніка аддзела прававога забеспячэння, інфармацыі і работы са зваротамі грамадзян Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Мікалая ІВАНЬКОВА**, контрагенты лжэструктур за тры месяцы добраахвотна заплацілі па прадпісаннях ОФР 330 млн рублёў без уліку дэнамінацыі. Ужо вынесеныя заключэнні ў дачыненні да 25 такіх структур. Па выніках завершаных да 1 жніўня праверачных мерапрыемстваў вынесена 95 прадпісанняў, а таксама праведзена 86 праверак фінансава-гаспадарчай дзейнасці выяўленых контрагентаў, звесткі ў дачыненні да 15 контрагентаў накіраваны ў падатковыя органы.

Эфектыўным інструментам у барацьбе з ілжэпрадпрымальніцтвам стаў Указ №14 «Аб дадатковых мерах па папярэджанні незаконнай мінімізацыі сум падаткаў». Ён накіраваны на зніжэнне колькасці праверак і стварэнне такіх умоў, калі кліентам ілжэструктур будзе нявыгадна працаваць з фірмамі-аднадзёнкамі.

Указ таксама стымулюе рэальны сектар эканомікі добраахвотна выплачваць у бюджэт падаткі па гаспадарчых аперацыях, якія ажыццяўляліся з ілжэструктурамі, не чакаючы, калі да іх прыйдуць органы фінансавых расследаванняў альбо падатковыя органы. «Калі суб'ект гаспадарання добраахвотна выплачвае неабходныя сумы, ён вызваляецца ад адміністрацыйнай адказнасці. Калі ж гэта ўмова не выконваецца, то яму прыйдзецца не толькі выплаціць падаткі, але і панесці адказнасць», — растлумачыў Мікалай Іванькоў. Інфармацыю пра лжэструктуры, у дачыненні да якіх Дэпартамент фінансавых расследаванняў склаў заключэнне, плануецца размяшчаць на афіцыйнай старонцы Камітэта дзяржкантролю ў інтэрнэце.

Акрамя таго, па словах Ігара Маршалава, у Беларусі плануецца павялічыць мінімальны памер шкоды, неабходнай для прыцягнення да крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад выплаты падаткаў. Цяпер злачынствам з'яўляецца ўхіленне ад выплаты падаткаў, зборах на суму больш за 1 тысячу базавых велічынь. Адпаведны праект закона знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. Дакладны парог шкоды пакуль невядомы.

Крымінальнае банкруцтва па-беларуску

ОФР надаюць асаблівую ўвагу праблеме неплацежаздольнасці і банкруцтва. Так, у сферы крымінальнага банкруцтва ў першым паўгоддзі сёлета супрацоўнікі ОФР выявілі 16 злачынстваў. «Калі ва ўсім свеце інструменты банкруцтва выкарыстоўваюцца ў мэтах перазагрузкі бізнесу, то ў Беларусі таксама і для ўхілення ад выплаты даўгоў, у тым ліку перад дзяржавай. Праблема вельмі сур'ёзная. Сумесна з Міністэрствам эканомікі, іншымі зацікаўленымі органамі і навукоўцамі праводзім семінары, абмяркоўваем шляхі процідзеяння гэтай крымінальнай з'яве. У хуткім часе, я думаю, па гэтым пытанні будзе наведзены парадак», — лічыць Ігар Маршалаў. Таксама ён не выключае карэкціроўкі адпаведнага заканадаўства. Такая мера пры гэтым не з'яўляецца экстраннай, а будзе праводзіцца згодна з планам.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Оценка всех видов собственности

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	Изолированное помещение (складское помещение) с инвентарным номером 350/D-271000, площадью 207,1 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 143А-6. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами.	**55 000 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 550 000 000)**	**5 500 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 55 000 000)**

Информация о земельном участке	Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006226 площадью 0,2249 га (договор аренды земельного участка от 23.01.2013 г.)
Срок подачи заявления	**По 25 августа 2016 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**
Дата, время и место проведения аукциона	**29 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266 Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация»
Условия продажи	Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 6 (шесть) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Подробная информация в газете «Звязда» от 16.06.2016 г. и по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341-15-45.

■ Жыллё маё

«КАМЕНЬ СПАТЫКНЕННЯ» Ў БУДАЎНІЦТВЕ — ІНФЛЯЦЫЯ

Аб'ёмы будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, а таксама стварэнне сістэмы жыллёвых накапленняў будуць залежаць ад стабільнасці беларускага рубля. Пра гэта журналістам паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ. Паводле яго слоў, сёння не ідзе гаворкі аб тым, каб налета павялічыць аб'ёмы будаўніцтва жылля з падтрымкай дзяржавы.

«Наша галоўная задача — захаваць такія ж аб'ёмы, як сёлета, — зазначыў міністр. — Трэба на 100 працэнтаў забяспечыць жыллём шматдзетныя сем'і, і гэта цяпер робіцца. У асноўным, гэта катэгорыя грамадзян чакае кватэры не больш за год, у тым ліку і ў Мінску».

Па словах Анатоля Чорнага, галоўнай праблемай застаецца памер інфляцыі, які не дазваляе сур'ёзна павысіць аб'ёмы будаўніцтва з дзяржпадтрымкай для грамадзян, што маюць патрэбу ў жыллі. Калі зніжэнне курса беларускага рубля будзе складаць не больш, чым 10 працэнтаў за год, можна будзе разглядаць пытанне аб павелічэнні такога субсідавання. Гэты ж паказчык стане вызначальным і для стварэння ў Беларусі сістэмы будаўнічых накапленняў. Мяркуецца, што пасля стварэння гэты механізм будзе даступны для ўсіх катэгорый грамадзян.

За мінулае паўгоддзе ў краіне было ўзведзена 2 мільёны 54 тысячы квадратных метраў жылля пры заданні ў 1 мільён 200 тысяч квадратных метраў. Гэта 52% ад гадавога плана. З іх 505,8 тысячы было пабудавана з дзяржпадтрымкай (гадавы план складае 840 тысяч квадратных метраў). Таму, на думку Анатоля Чорнага, усе задачы на год будуць выкананыя. Кошт квадратнага метра склаў 750 рублёў, і гэта таксама ніжэй за запланаваны гадавы паказчык у 790 рублёў.

Пытанне аб аб'ёмах жыллёвага будаўніцтва на 2017 год пакуль разглядаецца, але можна дакладна сказаць, што яны не будуць меншымі за 3 мільёны 500 тысяч квадратных метраў (сёлета гадавы план складае 4 мільёны квадратных метраў). У першую чаргу зніжэнне абумоўлена колькасцю зваротных сродкаў, за якія будуецца жыллё з дзяржпадтрымкай — цяпер іх хопіць толькі на пабудову 300 тысяч квадратных метраў жылля (для параўнання — сёлета плануецца ўзвесці 840 тысяч). Аб'ёмы камерцыйнага ж будаўніцтва застаюцца ранейшымі. Аднак пры распрацоўцы бюджэту міністэрства па даручэнні прэм'-ер-міністра будзе настойваць на павелічэнні дзяржаўнай падтрымкі, таму лічба ў 3,5 мільёна квадратных метраў пакуль неканчатковая.

Закраналася і пытанне арэндных кватэр — іх сёлета пабудавана каля 100 тысяч квадратных метраў. На 2017 год запланавана стварэнне 130 тысяч арэндных квадратных метраў, у тым ліку і ў сталіцы. Дарэчы, аб'ёмы будаўніцтва ў Мінску, па словах міністра, будуць зніжацца. Як паведаміў Анатоль Чорны, «максімальны аб'ём жылля, які мы можам узвесці ў сталіцы, з улікам усіх зносаў і ўшчыльненняў, складае 7 мільёнаў квадратных метраў».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■ Збіраем ранец

РАСКЛАД ШКОЛЬНЫХ КІРМАШОЎ

На спецыялізаваных выставах бацькі змогуць набыць усё неабходнае да новага навучальнага года.

У сталіцы з 11 па 21 жніўня ў Палацы мастацтваў (на вуліцы Казлова, 3) будзе адкрыта тэматычная выстава «Школьны базар ад «А» да «Я». 20-21 жніўня закупіць школьную форму і канцтавары мінчане змогуць на пляцоўцы каля Палаца спорту — там чакаецца агульнагарадскі кірмаш «Час у школу!». Міжнародныя спецыялізаваныя выставы будуць арганізаваны і ў цэнтры «БелЭкспа», з 24 па 31 жніўня.

Школьныя кірмашы запланаваны ў гэтым месяцы таксама ў Мінскай вобласці. 13 жніўня тэматычныя базары пройдуць у Барысаве і Жодзіне, 20-га — у Барысаве, Вілейцы, Любані, Маладзечне, Салігорску, Слуцку, 21-га — у Нясвіжы, 27-га — у Жодзіне і Вілейцы.

У Гродне спецыялізаваны кірмаш «Добры дзень, школа!» працуе да 4 верасня без выхадных. Свае тавары там прадстаўляюць 48 прадпрыемстваў.

Да 4 верасня дзейнічаюць пастаянныя кірмашы ў Гомелі: побач з цэнтральным рынкам і каля гандлёвага дома «Рэчыцкі». Кожныя выхадныя жніўня і 3-4 верасня гарадскія школьныя базары будуць арганізаваны таксама на плошчы Паўстання.

Фота Надзеі БУЖАН.

У Брэсце школьныя базары працуюць па вуліцы Гогаля кожныя выхадныя жніўня.

Магілёўскі спецыялізаваны кірмаш (знаходзіцца на пляцоўцы гандлёвага комплексу «Парк-Сіці») адкрыты штодзень да канца жніўня.

Базары для школьнікаў Віцебска запланаваны на 20 і 27 жніўня па вуліцы Леніна.

Усяго да навучальнага года плануецца правесці больш за дзве тысячы выстаў-продажаў для вучняў. Мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і будуць суправаджацца забаўляльнымі праграмамі, конкурсамі для дзяцей, рэкламнымі акцыямі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ЖУРНАЛІСЦКАЯ ПРАЦА АЦЭНЕНА

Спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» па Гомельскай вобласці Ірына АСТАШКЕВІЧ адна з узнагароджаных па выніках абласнога спаборніцтва сярод рэдакцый газет, арганізацый тэлебачання і радыё.

Ад імя Гомельскага аблвыканкама начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі ўручыла ёй ганаровую грамату — за шматгадовую працу ў журналістыцы, усебаковае асвятленне ў друку сацыяльна-эканамічнага развіцця Гомельскай вобласці.

У намінацыі «Лепшая газета» дыплом I ступені — у абласной газеты «Гомельская праўда». Лепшым журналістам друкаванага выдання прызнаны ўласны карэспандэнт газеты «Беларускі час», старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч.

Ул. кар.

Сістэма 3D-гуку ўжо ў Гродне

У горадзе над Нёманам адбылася прэм'ера фільма «Атрад самазабойцаў» у новым фармаце 3D-гуку.

Гродзенскі «Кастрычнік» стаў трэцім кінатэатрам у Беларусі, дзе ўстанавілі інавацыйную сістэму шматканальнага гуку Dolby Atmos.

— Мы стараемся ісці ў нагу з часам, каб нашы жыхары маглі глядзець кінафільмы з такой жа выдатнай якасцю гуку, як у Лондане, Парыжы ці Маскве, — зазначыў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Гроднааблкінавідэапракат» Юрый АЛЯКСЕЙ.**

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

Выратаваў на пажары траіх

Амаль апоўначы капыльскім выратавальнікам паступіла паведамленне пра загаранне жылога дома ў вёсцы Садавічы. Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца выкліку, аднапавярховы драўляны жылы дом гарэў адкрытым полымем.

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, да прыезду пажарных сусед праз аконны праём выратаваў гаспадара дома, яго жонку і сына. Мужчына, які знаходзіўся ў гасцях, пры выхадзе з дома атрымаў апёкі. Яго шпіталізавалі. Згодна з папярэднімі звесткамі, напярэдадні пажару выратаваныя і пацярпелы знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. У выніку пажару агнём знішчаны дах, жыллё выгарала знутры. Прычына здарэння ўстанаўліваецца. Разглядаецца версія неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

Продавец: УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0214) 45-62-12 (Локомотивное депо Полоцк)

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилого помещения площадью 65,7 кв.м, расположенного в капитальном строении с инв. №250/С-27224 по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, д. 58а (склад с рампой) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы: 14,78 базовой арендной величины. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации) 223,38/2 233 800 руб. **Размер задатка** (с учетом/до деноминации): 22,34/223 400 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: **06.09.2016 в 10.00** г. Полоцк, ул. Ленинградская, 64А в Локомотивном депо Полоцк. Срок внесения задатков и подачи документов: **с 08.08.2016 с 8.30 по 05.09.2016 до 17.30**

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на р/с организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан несостоявшимся, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. **Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

Уважаемые акционеры ОАО «Элегант» !

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Элегант»

СОСТОИТСЯ 16 августа 2016 года в 12.00,

регистрация акционеров с 11.00 по 11.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22 ОАО «Элегант», бухгалтерия.

УНН 600039318

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О сделках Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 01 августа 2016 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 9 до 11 часов, начиная с 10.08.2016 г., по месту нахождения Общества.

Справки по тел. 8 (01775) 9 43 74.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Организатор торгов ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ООО «Корунд»

СООБЩАЕТ РЕЗУЛЬТАТЫ ТОРГОВ

по продаже имущества ООО «Корунд», которые состоялись 04 августа 2016 в 12.00 по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 8

Проданы:

ЗАО «ТехноКлип» (ИНН 7825465909, адрес: 195030, РФ, г. Санкт-Петербург, ул. Химиков, д. 28)

Станок заточной ВЗ-319, 3 945,59 белорусского рубля, независимая оценка;

Станок плоско-шлифовальный 1400А, 6 904,17 белорусского рубля, независимая оценка;

Станок токарно-винторезный 250 ИТВМ.01, 3 106,85 белорусского рубля, независимая оценка;

Станок фрезерный 67К25 ПФ2.0, 2 416,47 белорусского рубля, независимая оценка;

Станок фрезерный FP-2, 3 204,18 белорусского рубля, независимая оценка.

Не продан:

Станок ножовочный металлореж. Мп6-1697, нет покупателя.

УНП 200228302

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса квитанция о приеме денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ, серии КС № 4555982 **считать недействительным.** УНП 100122726

Утерянный бланк квитанции 1-СУ серии СВ № 0262007, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительным.** УНП 101063229

■ Ну і ну!

Паляваў на... в'етнамскіх свінак

Інспектары Магілёўскай міжрайінспекцыі прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці двух жыхароў Клімавіч. Адным з іх быў сын мясцовага фермера, другім — яго прыяцель-паляўнічы.

Апошні наладзіў стральбу з карабіна на полі каля вёскі Слабодка, каб здабыць... в'етнамскіх свінак, што пасвіліся там. Некалькі дзясяткаў гэтых жывёл каля месяца таму збеглі з загона фермерскай гаспадаркі, расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. І вось такім незвычайным чынам гаспадары вырашылі «вярнуць сваё». Дзеянні паляўнічага былі расцэнены як незаконныя, паколькі ніякіх дакументаў, якія б дазвалялі яму паляваць на гэтай тэрыторыі, мужчына не меў. Да таго ж землі згаданай гаспадаркі адначасова з'яўляюцца часткай паляўнічых угоддзяў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Падарожнічаем

Як можна адпачыць на Палессі?

Адразу скажу: спосабаў шмат. Можна паехаць «дзікуном» і начаваць на беразе Прыпяці ў палатцы, можна спыніцца ў гасцявым дамку. Можна паехаць на Палессе, каб адпачыць ад гарадскога тлуму, а можна ўзбагаціцца духоўна: наведаць музеі, даведацца пра гісторыю рэгіёна, яго традыцыі і культуру.

Еду ў Столін не ўпершыню. Першы раз давялося там пабываць дажджлівым снежнем 2014-га. Цяпер жа еду — і ўсё ў зеляніне.

Дарэчы, дабрацца са сталіцы ў палескую глыбінку няпроста. У цотныя дні можна даехаць па чыгунцы да станцыі Гарынь, што непадалёку ад Століна. А вось у няцотныя трэба шукаць іншыя спосабы. Выбрала аўтобус. Білет каштаваў 215 тысяч, і за гэтыя грошы мяне «павазілі» ўсюды. Аўтобус заехаў у Слуцк, Салігорск, Жыткавічы, Тураў, Давыд-Гарадок... Дарога заняла 8 гадзін, і атрымалася своеасаблівая экскурсія па паўднёвым усходзе і поўдні нашай краіны. У Століне прыехала літаральна апоўначы — але ў гасцініцы мяне чакалі.

Некалькі слоў пра яе. Нумары ў адзінай столінскай гасцініцы «Гарынь» каштуюць ад 240 тысяч за суткі — даволі танна, асабліва ў параўнанні са сталічнымі гатэлямі. Гасцініца новая, у кожным нумары — сучасная мэбля і ўсе выгоды. Калі заплаціць трошкі больш, то дадуць двухмесны нумар, дзе ёсць халадзільнік. Адным словам, жыві, як твая душа жадае.

Столін — горад з насельніцтвам у дзесяць тысяч чалавек. У асноўным тут домікі аднапавярховыя, з агародзікамі і кветнікамі. Столінцы — людзі руплівыя. А пятай гадзіне з вуліцы даносяцца бадзёрыя і звонкія галасы. Людзі кіруюцца прынцыпам: хто рана ўстае, таму Бог падае.

Калісьці праз тэрыторыю цяперашняга Столінскага раёна праходзіў знакаміты шлях «з варагаў у грэкі». Цяпер па Прыпяці таксама часам ходзяць грузавыя параходы. Старажытная мінуўшчына Століншчыны паступова абрастае гіпотэзамі. Так, згодна з адной з іх, вядомы па дзіцячых казках Змей Гарынавіч родам менавіта з гэтых мясцін. Чаму? Таму што адной з галоўных рэк раёна з'яўляецца рака Гарынь, якая і дала герою былін прозвішча.

Асабіста мяне цікавілі прыродныя адметнасці Століншчыны, таму перш-наперш сустрэлася з **дырэктарам заказнікаў рэспубліканскага значэння «Сярэдняя Прыпяць» і «Альманскія балоты» Іванам ЯХНАЎЦОМ.** Ён расказаў, што цікавасць, як сярод нашых суайчыннікаў, так і сярод замежнікаў да адпачынку на Століншчыне ёсць. У самых маляўнічых частках раёна пабудавана некалькі дамоў адпачынку. Мы едзем у адзін з іх — у вёску Кораб'е. Да таго часу, пакуль заказнік не выкупіў там адзін домік, каб абсталяваць яго для турыстаў, жыхароў у вёсцы амаль не было. Але калі людзі ўбачылі, што тут можна адкрыць сваю справу, прычым у турыстычнай сферы, то вярнуліся. Цяпер у Кораб'і ладзіцца некалькі аграсядзіб.

Мой экскурсавод прызнаўся, што ён — прыхільнік індывідуальнага турызму.

— З чалавекам трэба пазнаёміцца, даць магчымасць і адпачыць, і даведацца нешта новае, — тлумачыць Іван Васілевіч. — Ад такой працы атрымліваеш задавальненне. А калі турызм масавы, то ўзнікае абыякавасць.

Іван ЯХНАВЕЦ паказвае маршруты падарожжаў па Прыпяці.

У Кораб'і Іван Яхнавец паказвае па сучаснаму абстаўлены дом з двума ўваходамі (гэта значыць, там адначасова могуць адпачываць дзве сям'і) і прапануе здзейніць невялікае падарожжа па Прыпяці на катары. Натуральна, ад такой прапановы нельга адмовіцца.

З сярэдзіны ракі адкрываецца цудоўны від на вёску. Дзе-нідзе на беразе можна ўбачыць рыбака. У адным месцы дзяўчына чысціць рыбу, каля яе лётаюць чайкі — спадзяюцца на пачастунак. Некаторыя з птушак займаюцца рыбалоўствам самастойна. Прагулка па рацэ супакойвае і расслабляе. Калі падплываем да моста, суразмоўца прапануе загадаць жаданне і гарантуе, што добрае і шчырае абавязкова збудзецца. Загадваю.

На жаль, не магу надоўга застацца ў заказніку. **Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Столінскага райвыканкама Васіль ЗАРУБА** запрашае наведаць вёску Гарадная, дзе знаходзіцца Цэнтр ганчарства.

— На базе Цэнтра ганчарства ладзяцца міжнародныя пленэры з 2008 года, — расказвае **дырэктар Цэнтра Васіль КАЗАЧОК.** — Пленэры праводзяцца з 25 ліпеня па 2 жніўня. Традыцыйна, акрамя беларусаў, на іх прыязджаюць ганчары з Расіі, Грузіі, Арменіі, Украіны, Польшчы, Малдовы, Даніі, Швецыі.

Заказнік «Сярэдняя Прыпяць» мае не толькі рэспубліканскае, але і міжнароднае значэнне. Нават тут захоўваюцца папуляцыі цэлага шэрагу відаў птушак, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знішчэння — у тым ліку вяртлявая чаротаўка, вялікі падворлік, драч, дупель.

Пленэры праходзяць на невялікай плошчы непадалёку ад самога Цэнтра.

— Жыхары вёскі, госці назіраюць за работай мастакоў. Людзей прыязджае шмат, але больш за ўсё — у дзень кірмашу пад назвай «Гараднянская мамзэлька», які звычайна ладзіцца напрыканцы пленэру, як правіла, у нядзелю. На ім прадаюць свае вырабы і мясцовыя майстры, і замежныя ўдзельнікі.

Традыцыйна ўдзельнікі пленэру дораць свае вырабы музею пры Цэнтры ганчарства. Чаго там толькі няма! Ёсць, напрыклад, рэчы, выкананыя з гліны па старажытных тэхналогіях! У музеі ёсць асобная зала, дзе захоўваюцца гліняныя вырабы, што засталіся ад продкаў.

На беразе Прыпяці.

— У Гарадной казалі: калі хлопец не навучыцца рабіць гаршкі, то за яго мясцовая дзяўчына замуж не пойдзе, — расказвае Васіль Казачок. — А калі дзяўчына не навучыцца вышываць, то яе ніякі хлопец замуж не возьме. Дзяўчына павінна падрыхтаваць сабе пасаг і пасля замужжа прынесці яго з сабой у хату мужа.

Удзельнік пленэраў Рыгор КАВАЛЬКА ганчарствам займаецца з маленства. Цяпер майстар вучыць ганчарству дзяцей — нават падчас летніх канікул яны прыходзяць амаль штодня.

У самім Століне таксама ёсць што паглядзець. Ад галоўнай плошчы, на якую выходзяць вокны гасцініцы, ідзе брукаваная вуліца. Калі ісці па ёй, то прыйдзеш у стары радзівілаўскі парк «Манькавічы». У Століне знакамітыя беларускія магнаты мелі рэзідэнцыю. На жаль, сама сядзіба была знішчана ў гады вайны. Ад яе застаўся толькі адзін з гаспадарчых будынкаў — там цяпер месціцца Столінскі раённы краязнаўчы музей, які лічыцца адным з найлепшых у Брэсцкай вобласці.

Кожны гаршчок мае сваю назву. «Мамзэлька» — самы малы гаршчок, у якім звычайна гатавалі кашу, ад яго і ідзе назва кірмашу. Трошкі большы гаршчок называецца «сямак» (іх калісьці прадавалі па сем штук, адгэтуль і назва). Яшчэ большы — злівач, ад слова «зліваць». У такіх гаршках звычайна гатавалася першая страва, напрыклад боршч. Гаршчок пад назвай «адзінец» такі вялікі, што ў той час, калі тыя ж «мамзэлькі» прадаваліся па дзесяць у партыі, ён ішоў адзін. Самы ж вялікі гаршчок называецца «паляк», у ім захоўвалі зерне.

— Сам палац быў падобны на рэзідэнцыю Радзівілаў у Нясвіжы, хоць і не такі манументальны і велічны, — успамінае **малодшы навуковы супрацоўнік музея Крысціна ЖАЎНЕРЫК.**

У адным з першых музейных памяшканняў бачу вялікі і — адразу відаць — вельмі старажытны човен, зроблены з суцэльнага дуба. У музей човен трапіў усяго год таму — праз засуху. Узровень вады ў Гарыні апусціўся так нізка, што на свет паказаўся човен. Сумеснымі намаганнямі яго выцягнулі, пачысцілі і адправілі ў музей.

Экспазіцыі ў музеі вельмі цікавыя. Ёсць залы, прысвечаныя дагістарычным часам, прыродзе, традыцыям і культуры століншкіх палешукоў, іх жыццю ў пераломныя моманты гісторыі.

Столін — адзін з самых аддаленых куткоў краіны. Ізаляванай, закрытай, дзякуючы прыродным асаблівасцям, была Століншчына ў часы Сярэднявечча, Новага часу і нават 100 гадоў таму. Гэта ў многім абараняла палешукоў ад розных захопнікаў.

— Прыродныя асаблівасці Столінскага раёна абумовілі яго лёс, яго аддаленасць ад усіх гістарычных падзей, што адбываліся на тэрыторыі тых дзяржаў, у склад якіх у розныя гады ўваходзіла Століншчына, — расказвае малодшы навуковы супрацоўнік музея. — Палешукі жылі сабе і жылі.

Сваю аўтэнтычнасць палешукі захоўваюць і сёння. Па рэках па-ранейшаму плывуць параходы, рыбацкія лодкі, прагулачныя катары. Папрацаваць побач з мясцовымі ганчарамі замежнікі лічаць за гонар. Няхай сёння, у XXI стагоддзі, многае адышло ў мінулае, але тут, на Століншчыне, гэта не адчуваецца так балюча. Вёскі жывуць, людзі захоўваюць уменні продкаў, і ўбачыць гэта сваімі вачыма — сапраўды варта.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by
Столінскі раён

У Цэнтры ганчарства (в. Гарадная).

ПОЗІРК У ГІСТОРЫЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння з удзелам беларусаў пройдуць кваліфікацыйныя турніры па акадэмічным веславанні, спартыўнай гімнастыцы, плаванні, боксе, настольным тэнісе, а таксама адбудзецца мужчынская шашэйная групавая гонка. У ноч з суботы на нядзелю ў барацьбу ўступяць беларускія баскетбалісткі. Свой першы матч яны правядуць з сапернiцамі з Японіі.

Напярэдадні першых навінаў ад нашай алімпійскай дэлегацыі раскажам пра самыя цікавыя факты старажытных Алімпіяд. Летнія Гульні ў Бразіліі 31-я па ліку, аднак адлік тычыцца толькі сучаснасці і вядзецца з 1896 года. Да гэтага было праведзена каля трохсот старажытных Алімпійскіх гульняў.

✓ Старажытныя спартсмены спаборнічалі на Алімпіядзе будучы цалкам голымі.

✓ Удзельнічаць у Алімпіядзе і глядзець яе маглі толькі мужчыны.

✓ Ужо ў старажытнасці Алімпійскія гульні былі вельмі значнай падзеяй, на час іх правядзення дзяржавы, якія ваявалі, заключалі паміж сабой мір.

Бяспеку Алімпіяды ў Бразіліі забяспечваюць 85 тысяч паліцэйскіх і вайскоўцаў...

✓ Раней на Гульнях было вельмі мала правілаў. Не было ніякіх вагавых катэгорый і адзінак вымярэння, а таксама не засякаўся час, таму што ў суддзяў тых часоў былі толькі пясочныя гадзіннікі. Перамагаў той, хто быў хутчэйшым або мацнейшым.

✓ На старажытных Алімпіядах быў такі від барацьбы — панкратыён. Можна сказаць, што гэта былі самыя першыя баі без правілаў. Існавала толькі два законы: нельга было кусацца і выдзіраць саперніку вочы. Калі байцы парушалі гэтыя ўмовы, то суддзі білі іх палкамі. Дарэчы, старажытнагрэчаскі філосаф Платон аднойчы быў пераможцам спаборніцтваў па падобнай барацьбе.

✓ Першыя сучасныя Алімпійскія гульні былі праведзены ў Грэцыі ў 1896 годзе, прычым спартыўныя дысцыпліны там былі досыць дзіўнымі і недарэчнымі, напрыклад перацягванне каната, штурханне каменя, скачкі з месца ў вышыню і плаванне з перашкодамі. Спартсменам трэба было праплыць пэўную дыстанцыю па рацэ, пераадольваючы пры гэтым бярвёны, якія плаваюць у ёй.

Так адкрываліся 1-я Гульні сучаснасці.

✓ У першыя 30 гадоў існавання Алімпіяд узнагароды атрымлівалі не толькі спартсмены, але і мастакі, паэты, скульптары, якія ў сваёй творчасці закраналі тэму спорту.

✓ Залатыя медалі, якія ўручаюцца пераможцам Гульняў, на самай справе ў сваім складзе маюць толькі 1% золата, усё астатняе — гэта серабро альбо іншыя сплавы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Зачапіла



В. Шкленнік. «ПЕНСІЯНЕРЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ ЗЛАЧЫНЦАЎ» *(«Звязда» за 30 ліпеня)*

— Што і казаць, тэма актуальная. Прыгадалася, як некалькі гадоў таму па пад'ездах у шматкватэрных дамах хадзілі нейкія людзі з клункамі. Яны расказвалі гісторыю, што, маўляў, едуць кудысьці за мяжу, але іх не прапускаюць з грузам вопраткі. Таму яны яе і распрадаюць. Самае цікавае, што якраз пенсіянеры і «вяліся» на прапановы гэтых гандляроў. Ну, а калі станавілася зразумела, што пад выглядам добрага тавару ім падсунулі няякасную танную падробку, то было ўжо позна.

Неяк да мяне прыходзіў міліцыянер. Ён цікавіўся інфармацыяй пра суседа, які не з'яўляўся па месцы жыхарства два месяцы... Але хто ж яго ведае, сапраўдны гэта ўчастковы міліцыянер ці ашуканец? Таму я выбраў за лепшае патэлефанаваць на апорны пункт і папрасіць да тэлефона гэтага міліцыянера. Але там адказалі, што ён якраз пайшоў у наш дом. Значыць, сапраўдны. Адчыняў дзверы і думаў, што пачую ў свой адрас незадаволеную рэпліку. Але міліцыянер з усмешкай вымавіў: «Перастрахоўваецеся? Правільна робіце!»

Я для сябе даўно ўсвядоміў: бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Дык навошта ж дабравольна ў яе сунуць галаву?

Іван Карнееў, *г. Бабруйск.*

Н. Дрындрожык. «КОЖНАЙ БЫ ВЁСЦЫ ПА ТАКОЙ НІКІЦІНАЙ» *(«Звязда» за 30 ліпеня)*

— Я асабіста не ведаю Людмілу Нікіціну, і пра Заронава чую ўпершыню. Але пасля таго, як прачытаў артыкул, вельмі захацелася выправіць гэтае ўпушчэнне. Якраз у мяне ў другой палове жніўня адпачынак. Мы з жонкай вырашылі сёлета не ехаць за мяжу, а павандраваць на машыне па Беларусі. Рыхтуемся, складаем маршрут. І ўжо ўключылі туды Заронава. Паедзем у музей не з пустымі рукамі — на гарышчы ў бацькоўскай хаце ў нас хапае рарытэтных прадметаў: калаўрот, прасы металічныя, цэлы чамадан цацак...

Я цалкам згодны з аўтарам артыкула: калі б у кожнай вёсцы было хоць бы па адной такой Нікіцінай, дык сельскі турызм у нашай краіне квітнеў бы! А так... Вёскі паступова пусцеюць. Узяць хоць бы тую, дзе я нарадзіўся: дык там цяпер з 300 жыхароў добра калі 10 засталося... А ўсё таму, што не знайшлося энтузіяста, «рухавічка». Таму заўсёды радуюся, калі чытаю ў «Звяздзе», што, напрыклад, бізнесмен вырашыў адрадзіць закінутую вёску Цінявічы ў Гродзенскай вобласці. І робіць там турыстычны комплекс...

І яшчэ... Я вельмі рады за Людмілу Канстанцінаўну. Як па мне, яна шчаслівы чалавек, бо ведае, дзеля чаго жыве, не распыляецца на пустое. Займаецца любімай справай, гуртуе вакол сябе аднадумцаў, а муж з сынам, што немалаважна, яе падтрымліваюць. Бо, думаю, не кожнаму б спадабалася, што жонка сямейны бюджэт укладае ў музей. Дай Бог здароўя і доўгіх гадоў жыцця гэтай прыгожай жанчыне!

Уладзімір В., *Мінск.*

Н. НІКАЛАЕВА. «РЭКОРДЫ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ» *(«Звязда» за 4 жніўня)*

— Скажыце, чаму ўсіх хвалююць невысокія балы на інжынерных спецыяльнасцях, а 130—140 балаў, з якімі абітурыенты паступаюць на «фізіку», «матэматыку», «інфарматыку» ў педагагічныя ВНУ ці ў Белдзяржуніверсітэт, успрымаюцца ўжо як норма? Няўжо магчыма выхаваць будучага настаўніка з такім «багажом» ведаў на старце? Значыць, зноў ВНУ будуць вымушаны ўводзіць спецыяльныя курсы, каб хоць крыху падцягнуць слаба падрыхтаваных першакурснікаў да ўніверсітэцкага ўзроўню. А потым зноў будзем здзіўляцца, чаму абітурыенты не ведаюць, якім прыборам вымяраецца сіла тока. А хто іх вучыць у школе?

На жаль, вышэйшая адукацыя стала ў нас усеагульнай. Яна даступная ўсім, у каго ёсць сродкі, каб аплачваць сваё навучанне. Паглядзіце на прахадныя балы на платную форму навучання. Спецыяльнасць «праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі» ў БДАТУ — усяго 84 балы! Зоймемся арыфметыкай: дапусцім, абітурыент набраў мінімальную колькасць балаў па трох тэстах (10+15+10 балаў) — гэта 35 балаў у суме. Які ж у яго сярэдні бал школьнага атэстата — 5,0? І гэта будучы канструктар? А на вельмі многіх спецыяльнасцях прахадныя балы ўвогуле адсутнічаюць — гэта значыць, што ўзялі ўсіх, хто падаў дакументы!

Абсалютна відавочна, што ЦТ прыцягвае шмат выпадковых людзей. І ўстаноўленыя мінімальныя парогі — умоўная рэч. Няўжо 5 балаў, якія трэба набраць на ЦТ будучым ваенным, пагранічнікам, праваахоўнікам ці ратавальнікам, можна назваць сур'ёзным шлагбаумам на ўваходзе? Давайце будзем шчырымі і лепш увогуле адменім мінімальны парог або... усё ж такі задумаемся над тым, ці патрэбна нам столькі людзей з дыпломамі, але без ведаў?

Б.Г., *Мінская вобл.*

Н. Зігуля. «ЁН НІКОЛІ НЕ КРЫВІЎ ДУШОЙ» *(«Звязда» за 3 жніўня)*

— Мы сёння вельмі шмат гаворым пра патрыятызм, пра вайну, пра тое, як здзекліва перапісваецца гісторыя не зацікаўленымі ў праўдзе краінамі, якія хочуць дыктаваць сваю волю іншым народам. На гэтым фоне творы Алеся Адамовіча асабліва каштоўныя сваёй праўдзівасцю і дакладнасцю. Вельмі добра, што ў Беларусі знайшлося выданне, якое мэтанакіравана, настойліва, крок за крокам ажыццяўляе такі важны праект. Дзякуй газеце за такую вялікую справу.

Кажуць, што першай ахвярай на вайне становіцца праўда. Мой бацька, франтавік, лічыў Алеся Адамовіча пісьменнікам і публіцыстам з вялікай літары. Менавіта за тое, што той казаў гэтую праўду нават тады, калі яе не хацелі чуць. Я чытала артыкул у газеце, і мне ўспаміналіся словы вядомага расійскага кіназнаўцы Армена Мядзведзева пра фільм «Ідзі і глядзі». Гэты чалавек з 1984 года ўзначальваў Галоўную сцэнарна-рэдакцыйную калегію Дзяржкіно СССР. Ён пісаў: «Тое, што мы ўбачылі падчас прагляду фільма ў Дзяржкіно, выклікала адчуванне шоку. Так аб Айчыннай вайне яшчэ ніхто не здымаў, такога народа-воіна і пакутніка мы на экране да гэтай пары не бачылі. Пасля прагляду я папрасіў прабачэння ў Алеся Адамовіча і Элема Клімава за тых, хто не верыў у карціну, хто перашкаджаў ёй».

Упэўнена, што музей усё ж такі адкрыецца. У гэтым павінны быць зацікаўлены мы ўсе да аднаго. Няўжо мы не разумеем, што гэта не проста памяць, гэта — наша сумленне? А яно або ёсць, або яго няма.

Вераніка Сяргееўна, *Брэсцкая вобласць.*

ZVAROT@ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY

НУМАР «ЛЮКС» ДЛЯ БАРСІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З гаспадаром заключаюць дагавор на аказанне паслуг па часовым утрыманні ката ці сабакі. Каб засяліць жывёлу, трэба мець пры сабе яе ветэрынарны пашпарт і запоўніць анкету. Пытаюцца пра асаблівасці характару гадаванца, яго звычайны рацыён, шкодныя звычкі — усё, каб зрабіць пражыванне чатырохлапага камфортным.

На жаль, прыстроіць у гатэль на час адпачынку можна не кожную жывёлу. Як правіла, не прымаюцца байцоўскія пароды сабак, хворыя і аслабленыя гадаванцы. Тых, каму больш за восем гадоў, бяруць толькі пад распіску ад гаспадара, што той не будзе прад'яўляць прэтэнзій праз магчымыя наступствы па ўзросце.

Бегавая дарожка і папка з пажаданнямі

Ці ўдаецца запоўніць гатэлі для жывёл у летні сезон? **Уладальніца гасцініцы «Чатыры лапы» Людміла ЗАХАРАНКА** кажа, што ў іх з 16 месцаў цяпер заняты 11 (у астатнія поры года звычайна толькі 6-8). Гадаванцаў прывозяць у асноўным на 10-14 дзён.

Харчаванне — у адпаведнасці з указаннямі, якія пакідаюць гаспадары. Сухі корм, вільготны, каша з мясам, малако... Плюс, паколькі гасцініца знаходзіцца на прыватным участку, жывёл частуюць прысмакамі з агарода.

— Хутка да нас прыедзе сабака, кітайскі хахлаты, — аматар груш. Якраз грушавы сезон пачынаецца, — дзеліцца Людміла. — Нехта агуркі любіць. Каты звычайна пырнік ядуць. Для мяне гэта пустазелле, а для іх — найлепшы прысмак.

З дадатковых паслуг карыстаюцца попытам заняткі на бегавой дарожцы: некаторым пародам сабак недастаткова кароткіх прагулак.

Гасцініца, дарэчы, гатова прымаць розных жывёл. Аддавалі, напрыклад, пацукоў, папугая, рыбак. «На другі год хочуць прывезці труса. Лічаць пакуль, ці атрымаецца па грашах. Але ў асноўным на часовым утрыманні знаходзяцца каты і сабакі. Догляд іншых гадаванцаў, тых жа рыбак, прасцей даручыць суседзям», — мяркуе Людміла.

У іншай гасцініцы — «ZOOHOTEL» — цяпер жывуць адзінаццаць сабак і тры кошкі. Ёсць яшчэ месцы для шасці жывёл. Сабакі прыязджаюць розных памераў: ад маленькіх ёркаў і балонак да вялікіх сенбернараў і ірландскіх ваўкадаваў. Буйныя пароды засяляюць у вулічныя вальеры з будкамі, сабак, якія прывыклі да кватэрнага ўтрымання, — у спецыяльны домік. Дэкаратыўныя пароды разам з кошкамі жывуць у доме, у сям'і.

Першая дзяржаўная гасцініца для жывёл адкрылася толькі тры тыдні таму. Гэта самы вялікі гатэль — у ім каля 70 нумароў. Заняты пакуль толькі чатыры.

Па словах **гаспадыні гатэля Алесі ПАЛУЯН**, асаблівыя пажаданні па ўтрыманні жывёл бываюць не часта:

— Як правіла, стандартны догляд падыходзіць усім. Чаму сам гаспадары ўсё ж такі пішуць памяткі пра тое, як іх гадаванца расчэсваць, як гуляць, мыць лапы, якія вітаміны даваць. Такія памяткі я захоўваю ў асобнай папцы. Практычна ўсе пажаданні мы можам выканаць.

Хто з жывёл перажывае разлуку больш? Алеся кажа, што сумуюць усе: сабакі па гаспадару, кошкі — па доме. А вось шчанюкі і кацяняты практычна не сумуюць, іх лягчэй адцягнуць гульнёй ці прысмакамі. На другі-трэці дзень гадаванцы звычайна адаптуюцца.

— Каб мінімізаваць стрэс, прапануем прыехаць да нас загадзя і пазнаёміцца з новымі людзьмі і абстаноўкай. Тады другім разам жывёлы пазнаюць гэта месца і не будуць моцна перажываць.

«У асноўным на часовым утрыманні знаходзяцца каты і сабакі. Догляд іншых гадаванцаў, тых жа рыбак, прасцей даручыць суседзям».

Першая дзяржаўная гасцініца для жывёл адкрылася толькі тры тыдні таму. Гэта самы вялікі гатэль — у ім каля 70 нумароў. Заняты пакуль толькі чатыры.

— Няшмат, — згаджаецца **Тамара ЦАРЫКОЎСКАЯ, дырэктар прадпрыемства «Фаўна горада»**, на базе якога знаходзіцца гатэль. — Але попыт ёсць: частка месцаў распісана да канца жніўня.

Пастаяльцамі пакуль былі толькі сабакі. Прыязджалі звычайна на 2-3 дні.

У гасцініцы ёсць чатыры нумары «люкс», кожны па 12 квадратных метраў (для параўнання: плошча звычайнага пакоя для ката — паўтара «квадрата», для сабакі — чатыры). Адзін з іх цяпер якраз заняты.

Тамара Царыкоўская расказвае, што перад тым як адкрыць гатэль, яны праводзілі апытанне. Са снежня размяшчалі аб'явы на жыроўках, цікавіліся, ці здалі б людзі сюды свайго гадаванца, колькі гатовы былі б заплаціць за пражыванне. З улікам гэтай інфармацыі і планавалі сваю дзейнасць. Расцэнкі ў дзяржаўнай гасцініцы, дарэчы, крыху ніжэйшыя за сярэднія па горадзе. Нумар для ката, без выдаткаў на харчаванне, каштуе 12,7 рубля ў суткі, для сабакі — ад 14 да 18 рублёў у залежнасці ад памеру жывёлы. «Люксавы» пакой, зразумела, даражэйшы — 24,6 рубля.

Пад прыглядам прафесіяналаў

Пра сэрвіс і зручнасць гасцініц мы распыталі мінчан, якія карысталіся іх паслугамі. Кацярына, гаспадыня англійскага бульдога, пакідае свайго любімца ў гатэлі адзін-два разы на год. Прызнаецца: гэтай пародзе патрэбен асаблівы догляд, таму даручыць сабаку суседзям ці сваякам не можа.

— Англійскія бульдогі ў спякоту могуць пачаць задыхацца. Яны гуляюць, скачуць і не адчуваюць, што варта спыніцца, — тлумачыць Кацярына. — Пачынаецца прыступ, які трэба своечасова заўважыць і прыняць адразу меры па выратаванні. Тыя, хто трымаў такую пароду, ведае, што рабіць. Плюс улетку бульдогу трэба праціраць складкі. У гасцініцы нясуць адказнасць за жывёлу, таму дакладна выконваюць усе нашы пажаданні. У адрозненне ад сваякоў, якія могуць рабіць гэта не так добрасумленна. Дый у знаёмых няма магчымасці ўзяць нашу Тэйку да сябе.

На думку Кацярыны, гатэль павінен быць прасторным. І абавязкова побач з жывёламі мусіць знаходзіцца хтосьці з людзей, каб гадаванцы не сядзелі ў адзіноце.

Гаспадыня сабакі Марына часта бывае ў камандзіроўках. Для свайго Тоці на час ад'езду яна стараецца стварыць максімальна камфортныя ўмовы.

— Нам вельмі важна, каб пры любых непрадбачаных абставінах жывёле аказалі высокакваліфікаваную дапамогу і звязаліся з намі. Таксама хочам, каб Тоці ў нашу адсутнасць весела праводзіў час, а ва ўмовах гасцініцы ў яго гэта добра атрымліваецца. За некалькі гадоў ён ужо паспеў знайсці сяброў, з якімі можна ўдосталь набегацца на свежым паветры, таму знаходжанне ў гатэлі ён успрымае як канікулы ў дзіцячым лагеры.

«У гасцініцы нясуць адказнасць за жывёлу, таму дакладна выконваюць усе нашы пажаданні. У адрозненне ад сваякоў, якія могуць рабіць гэта не так добрасумленна».

Ларыса трымае двух катоў. Паслугамі гатэля для жывёл карыстаецца ўжо гадоў пяць. Вось і цяпер яе сфінксы адпачываюць у нумары, пакуль жанчына гасцюе за горадам у сястры.

Пра тое, каб пакідаць катоў на час водпуску знаёмым, Ларыса нават не думала: «Я да гэтага стаўлюся нашмат больш сур'ёзна. Лічу, што кожнай справай павінен займацца прафесіянал».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

АД СТАЖОРА — ДА ПРАФЕСАРА АСВЕТЫ

ЧАМУ ПОЛЬСКІЯ НАСТАЎНІКІ ЛІЧАЦЬ ПРАФЕСІЙНУЮ ЛЕСВІЦУ ЗАНАДТА КАРОТКАЙ?

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Ці прэстыжная прафесія педагога ў польскім грамадстве? За час азнаямленчага візіту беларускіх настаўнікаў у Варшаву журналіст «Звязды» задаваў гэта пытанне мноства разоў: дырэктарам школ, звычайным настаўнікам і супрацоўнікам Цэнтра развіцця адукацыі. У адказ усе ўсміхаліся, але чамусьці з сумам...

У Варшаве на набярэжнай Вісты ўстаноўлены алегарычны помнік настаўніку. Ён уяўляе сабой скульптуру мужчыны антычнай эпохі ў набедранай павязцы, які трымае над галавой цяжкі камень. Але якая сувязь паміж міфалагічным персанажам і настаўнікам? Знаўцы грэчаскай міфалогіі без праблем зразумеюць алегорыю: Гамер у сваёй паэме «Адысея» расказаў пра цара Карынфа Сізіфа, які правініўся перад багамі і быў асуджаны імі на вечныя пакуты. Сізіф павінен быў закаціць велізарны камень на вяршыню гары, але як толькі камень аказваўся ўверсе, ён тут жа зрываўся ўніз. Таму спробы даводзілася паўтараць зноў і зноў і так... да бясконцасці. Між іншым, педагогі, не пазбаўленыя гумару, жартуюць: набедраная павязка — сімвал таго, як плацяць настаўніку за яго цяжкую працу...

Як жа насамрэч жывецца польскім педагогам і ці ёсць чаму пазайздросціць іх беларускім калегам, мы і паспрабавалі разабрацца...

Адзіны падручнік — для пачатковай школы

— Польская сістэма адукацыі цяпер знаходзіцца ў перыядзе рэфармавання, — канстатуе **кіраўнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Цэнтра развіцця адукацыі Катажына КАЛЕТЫНСКА.** — Міністэрства адукацыі распачало зімой адкрытую дыскусію наконт школьнага праграмнага мінімуму. Пасля яе завяршэння вынікі абяцаюць прадставіць грамадскасці.

Цэнтр развіцця адукацыі з'яўляецца ў Польшчы галоўнай дзяржаўнай установай, якая адказвае за паляшэнне якасці навучання і рэфармаванне сістэмы адукацыі ў рэчышчы дзяржаўнай палітыкі ў галіне асветы і выхавання. У яго структуры дзейнічаюць аддзелы спецыяльных адукацыйных патрэб, рэабілітацыі і сацыяльнай тэрапіі, выхавання і прафілактыкі, развіцця моўнай кампетэнцыі, грамадскіх і грамадзянскіх навыкаў, аддзел адкрытых адукацыйных рэсурсаў і іншыя. Катажына Калетынска паведаміла, што цэнтрам ужо створаны 58 электронных падручнікаў па 14 школьных прадметах, а таксама для дашкольнага навучання, якія падыходзяць для самых розных прыладаў (камп'ютараў, лэптопаў, планшэтаў, смартфонаў, інтэрактыўных дошак) у версіях offline і online. Галоўны дэвіз інавацыйнага праекта — «Бясплатна, даступна, інтэрактыўна».

Дарэчы, да апошняга часу права выбіраць, па якім падручніку працаваць, было за настаўнікам. Праект «адзіны падручнік» рэалізаваны толькі на ўзроўні першых-трэціх класаў пачатковай школы. Гэта быў заказ Міністэрства адукацыі, таму кожны вучань атрымлівае падручнік бясплатна.

— Бацькі школьнікаў скардзіліся, што ў выпадку, калі настаўнік сам выбірае падручнік, да яго затым патрабуецца цэлая серыя дапаможных матэрыялаў, якія даводзілася набываць бацькам. Адпаведна іх выдаткі раслі, яны былі незадаволеныя і выказвалі пажаданні, каб дзяржава зрабіла адзін падручнік, — расказвае Катажына Калетынска. — Але тут ужо пачалі абурацца настаўнікі: раней у іх было шмат дадатковага матэрыялу для работы на ўроку, а цяпер ім далі «голы падручнік» без усялякіх дапаможнікаў... І тады Цэнтр развіцця адукацыі атрымаў заданне падрыхтаваць дапаможныя матэрыялы да адзінага падручніка. Карты працы настаўнік цяпер раздрукоўвае з сеціва, а затым раздае іх вучням на ўроку для выканання. У адной са школ мы пацікавіліся, на каго пры раздрукоўцы раздатачнага матэрыялу кладуцца выдаткі? Высветлілася, што іх нясе школа: шмат сродкаў патрабуюць картрыджы для размнажальнай тэхнікі, але гэта не галаўны боль настаўнікаў.

А база партала Scholaris утрымлівае бясплатныя электронныя адукацыйныя матэрыялы да кожнага этапу навучання: практыкаванні, гукавыя матэрыялы, сцэнарыі ўрокаў, тэсты, дыдактычныя матэрыялы, мультымедыйныя прэзентацыі, здымкі і ілюстрацыі, фільмы і мультфільмы — усяго 26 700 пазіцый. У педагогаў пад рукой — багаты выбар для таго, каб зрабіць свой урок непаўторным. **Палёт педагагічнай думкі ніхто не абмяжоўвае. Увогуле прафесійная свабода настаўнікаў у польскіх школах — асобная тэма.**

Уніфікацыя ці варыятыўнасць?

Ёсць праграмны мінімум, які кожная школа павінна рэалізаваць (менавіта ён і стаў прадметам для дыскусій). У стандарце прапісана, што павінен ведаць і ўмець вучань па гэтым прадмеце. Якімі сродкамі будзе дасягнута мэта, нікога не хвалюе, але засваенне вучнямі праграмнага мінімуму правяраецца пасля заканчэння пачатковай школы і гімназіі. Ацэньванне практыкуецца толькі знешняе: у краіне дзейнічаюць цэнтральная і акруговыя экзаменацыйныя камісіі.

На засваенне праграмнага мінімуму адводзіцца 60 працэнтаў усяго часу, яшчэ 40% часу — гэта ўжо зона аўтаноміі настаўнікаў. Праграмны мінімум можна дапаўняць па ўласным прадстаўленні, напрыклад аўтарскімі методыкамі і праграмамі. Але ёсць розныя ўзроўні настаўніцкага статусу. Аўтарскую праграму можа распрацаваць толькі дыпламаваны настаўнік. Ён прадстаўляе яе на школьны педсавет, і той або яе зацвярджае, або адхіляе. Увядзенне аўтарскай праграмы можа патрабаваць павелічэння колькасці гадзін на вывучэнне прадмета. А калі неабходна заплаціць больш за працу настаўніка, трэба звяртацца ў вышэйстаячую ўстанову, бо грошы выдзяляюцца мясцовымі ўладамі.

Ніякіх нормаў праверкі сшыткаў няма. Настаўнік сам вырашае, калі і якія работы яму правяраць. Па многіх прадметах сшыткі правяраюцца адзін-два разы ў семестр (вучэбны год дзеліцца на два семестры) і нават па польскай мове — 4—5 разоў за семестр. Наяўнасць у настаўніка плана-канспекта ўрока кіраўніцтва школы не хвалюе — гэта зона аўтаноміі педагога. Ніхто, у тым ліку і дырэктар, не можа прыйсці на ўрок і папрасіць настаўніка прад'явіць канспект...

І ўсё ж дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі імкнецца да ўніфікацыі. Як заўважыла Катажына Калетынска, праграмны мінімум будзе перагледжаны, і ў які бок, пакуль невядома. Хоць ідэя з увядзеннем адзінага падручніка настаўнікаў зусім не радуе.

Алегарычны помнік настаўніку ў Варшаве. Набедраная павязка — «сімвал» таго, як плацяць настаўніку за яго цяжкую працу...

Экзамен на прафесійную прыдатнасць

Педагагічныя спецыяльнасці ў Польшчы не займаюць у прыярытэтах моладзі верхнія пазіцыі. У фінансавым плане гэта не самая высокааплатная праца. Ды і, шчыра кажучы, уладкавацца на работу пасля заканчэння вучобы — задача няпростая. Дэмаграфічны крызіс прымушае настаўнікаў трымацца за свае месцы. Кожная ўстанова адукацыі сама зацвярджае рэгламент прыёму на работу. Дырэктар можа на конкурснай аснове выбраць настаўніка на вакантнае месца. Малады настаўнік павінен чымсьці зацікавіць адміністрацыю школы, прайсці сумоўе, правесці ўрок — ніхто не стане браць «ката ў мяху», хоць і з універсітэцкім дыпломам.

Сцяжынка кар'ернага росту ў польскіх настаўнікаў даволі кароткая. Выпускнік педагагічнай ВНУ, які трапляе на работу ў школу, называецца **настаўнік-стажор.** Дзевяць месяцаў (адзін навучальны год) — ён фактычна знаёміцца з асаблівасцямі працы і вучыцца прафесіі. Але наперад мусіць напісаць план асабістага прафесійнага развіцця на першы школьны год. Дырэктар зацвярджае гэты план і замацоўвае за стажорам больш вопытнага настаўніка-ментара. Пасля 9 месяцаў збіраецца камісія, аналізуе, ці выкананы план, якімі кампетэнцыямі авалодаў стажор, і вырашае, ці можна яму прысвоіць другую катэгорыю — **настаўнік-кантрактнік.** Фактычна гэта ўнутрышкольны экзамен на прафесійную прыдатнасць. Калі малады настаўнік яго не здае, яму даецца магчымасць паўтарыць спробу праз 9 месяцаў.

Для таго, каб прэтэндаваць на наступную ступень у кар'еры, педагог мусіць адпрацаваць у школе яшчэ два гады. Затым ён зноў піша план свайго прафесійнага развіцця і рэалізуе яго цягам 33 месяцаў. Збіраецца камісія, у якую ўваходзяць дырэктар установы адукацыі, прадстаўнік мясцовай улады і два эксперты (ёсць спіс зацверджаных Міністэрствам адукацыі экспераў). Новая ступень — прызначаны, або **штатны, настаўнік.** З гэтай кваліфікацыяй трэба адпрацаваць не менш як год, затым скласці новы, вельмі грунтоўны, план свайго прафесійнага развіцця — чаму настаўнік будзе вучыцца, каб значна павысіць свае кампетэнцыі (а гэта немагчыма без засваення сучасных ІТ-тэхналогій). На рэалізацыю плана зноў даюцца 33 месяцы. Яго вынікі ацэньвае камісія, толькі колькасць знешніх экспертаў павялічваецца ўжо да трох. Чацвёртая ступень — **дыпламаваны настаўнік** (аналаг вышэйшай катэгорыі ў Беларусі) — фактычна апошняя.

— Педагогі лічаць, што кар'ерная лесвіца ў іх — занадта кароткая. Дасягнуць катэгорыі «дыпламаваны настаўнік» пры жаданні можна за 10 гадоў, а далей ў настаўніка ўжо няма матывацыі павышаць сваю кваліфікацыю, — канстатуе Катажына Калетынска. — Больш за палову настаўнікаў у польскіх школах ужо маюць катэгорыю «дыпламаваны настаўнік». Ёсць яшчэ і ганаровы тытул «прафесар асветы», які ў большай ступені падкрэслівае заслугі чалавека і не адбіваецца на яго заробках. Для таго, каб прэтэндаваць на гэты тытул, трэба мець сама меней 20-гадовы стаж працы настаўнікам і сама меней 10-гадовы стаж працы дыпламаваным настаўнікам. Пачынаючы з 2008 года, калі быў уведзены гэты тытул, яго атрымалі ўсяго 133 педагогі (прыкладна па 10 чалавек у год). Раней прафесар асветы пры прысваенні яму гэтага тытула атрымліваў аднаразовую прэмію ў памеры свайго шасцімесячнага акладу, а паколькі памер заробкаў у розных установах адукацыі мог адрозніваца, то адрозніваласа і сума выплаты. Таму было вырашана ўстанавіць адзіную для ўсіх суму — 18 тысяч злотых (курс долара да злотага прыблізна 1 да 3,9).

Цяпер у Польшчы хочуць увесці пятую ступень «настаўнік-спецыяліст»: яна будзе прызначацца альбо настаўнікам з навуковай ступенню, альбо настаўнікам, якія рэалізуюць нейкую інавацыйную методыку навучання.

Супраць прафесійнага самавыгарання

Згодна з заканадаўствам, базавы аклад для настаўніка-стажора складае 2256 злотых. Ад гэтага трэба яшчэ адмінусаваць падаткі. Базавы аклад дыпламаванага настаўніка — 3100 злотых. Як відаць, розніца ў аплаце, у залежнасці ад катэгорыі, не такая істотная. Ёсць яшчэ і прэміяльны фонд.

— Калі настаўнік — малады, гэта яшчэ не значыць, што ён горшы, — падкрэслівае **дырэктар школьнага комплексу №1 у Канстанціне Паўліна КАРЧМАРЧЫК.** — І дырэктар школы заўсёды знойдзе магчымасць, каб падтрымаць добрага педагога. Нават калі няма магчымасці дапамагчы яму грашыма, можна стварыць магчымасці для яго развіцця і прафесійнага росту.

Дарэчы, мужчыны-настаўнікі ў польскіх школах — у вострым дэфіцыце. У адной са школ нам агучылі прапорцыю (у педагагічным калектыве працуюць 40 жанчын і толькі тры мужчыны) і жартам прапанавалі мужчынам з беларускай дэлегацыі затрымацца ў іх...

Настаўнікі працуюць 40 гадзін на тыдзень (з панядзелка па пятніцу), але ўрочная нагрузка складае 18 гадзін. Плюс дзве гадзіны адводзіцца на дадатковыя заняткі з вучнямі. Працягласць адпачынку ў настаўнікаў складае 56 каляндарных дзён на год, але ў іх уваходзяць і два тыдні калядных канікул. **Субота — выхадны дзень для ўсіх: і вучняў, і педагогаў. Прынцып просты: калі вучні ў школе, тады і настаўнікі ў школе, і наадварот.**

Правы педагогаў у Польшчы абараняе «Хартыя настаўніка», прынятая яшчэ ў 80-я гады XX стагоддзя. Хартыя мае статус закона (у ёй прапісаны падрабязна ўсе правы і абавязкі педагогаў) і ўтрымлівае шэраг прывілей для настаўнікаў, у тым ліку сельскіх. Але калі ў краіне распачаліся рынкавыя змены, педагогі адчулі на сабе ціск — высветлілася, што не ўсе задаволеныя «асаблівымі ўмовамі», створанымі для настаўнікаў. Многія лічаць, што тыя маюць зашмат вольнага часу (не разумеюць, што праца педагога не вымяраецца 18 урокамі ў тыдзень). Зайздросцяць працягласці іх адпачынку. Да таго ж для таго, каб застрахаваць настаўніка ад прафесійнага самавыгарання, хартыяй прадугледжаны гадавы аплатны акадэмічны адпачынак. Для таго, каб яго атрымаць, настаўнік павінен адпрацаваць з дзецьмі ў класе не менш як 10 гадоў і мець адпаведныя медыцынскія паказанні...

Сёння над Хартыяй навісла рэальная пагроза. Вядуцца дэбаты, што з ёй рабіць: увогуле ад яе адмовіцца ці мадыфікаваць? Аднак далёка не кожны палітык адважыцца «пайсці на вайну» з настаўнікамі. Педагогі — магутная сіла, з якой цяжка не лічыцца.

І ўсё ж, з чым звязана няўпэўненасць польскіх настаўнікаў у заўтрашнім дні? З недастаткова высокімі заробкамі, дэмаграфічнай сітуацыяй і страхам страціць работу ці, можа быць, яшчэ з нейкімі прычынамі? Калі паглядзець на вынікі міжнароднага даследавання адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA, то Польшча займае сярод еўрапейскіх краін верхнія прыступкі, а значыць, са сваёй задачай педагогі выдатна спраўляюцца...

Як прызналіся самі настаўнікі, сёння адбываюцца змены і ў сістэме адукацыі, і ў стаўленні грамадства да школы. І часта самі настаўнікі не разумеюць, чаго ад іх чакаюць...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by
Мінск—Варшава—Мінск.

ДЗВЕ МУЗЫ КАРАЛЯ

Карэспандэнт «Звязды» ў Літве пазнаёміўся з каралём керамікі, даведаўся, як самабытнасць супрацьстаіць глабалізацыі, і літаральна пад нагамі знайшоў... СССР.

У музеі керамікі пад Уценай кожны можа адчуць сябе каралём.

НА СВАЕ РУКІ

Вітаўтас Валюшыс лічыцца адным з лепшых керамістаў Еўрапейскага саюза, што пацвярджае ўзнагарода «Залаты вянок» і тытул караля керамікі. У яго багатай калекцыі ёсць і беларуская керамі-ка. Вітаўтас перакананы, што музей, які ён стварыў паблізу літоўскага горада Уцена (літ. Utena) не мае аналагаў у свеце. Цяпер у ім каля 20 тысяч экспанатаў.

Самы вядомы ў Літве керамі-ст Вітаўтас ВАЛЮШЫС.

Музей керамікі пана Вітаўтаса, рамесніка з больш чым 40-гадовым стажам, знаходзіцца ў двухпавярховым будынку, узведзеным да Другой сусветнай вайны, потым там змяшчалася школа. Ганчар самастойна адрамантаваў будынак. Яго прыватная ініцыятыва па стварэнні ўнікальнага ганчарнага цэнтра была падтрымана ў рамках трансгранічнага праекта Еўрапейскага саюза «Музейныя вароты».

— На жаль, глабалізацыя нясе пагрозу страты нацыянальных традыцый. У Еўропе, ды і не толькі, цяпер маюцца нядобрыя тэндэнцыі: рамеснікі капіруюць адзін аднаго, робяць тое, што не ўмеюць, не адчуваюць. А трэба ствараць тое, што адчуваеш, важна не забываць свае карані, — лічыць майстра.

Ён не толькі з задавальненнем паказвае калекцыю шматлікім гасцям, але і саджае ахвотных за ганчарнае кола і дазваляе на свае рукі адчуць цуд пераўтварэння кавалка гліны ў непаўторную рэч.

— Я ў дзяцінстве быў маленькага росту, а мой лепшы сябар — высокі прыгажун. Дык у яго ўсе дзяўчаты былі закаханыя, а мне трэба было займацца самба, пісаць вершы, музыку, добра танчыць, каб не адставаць, — смяецца Вітаўтас. — А потым заняўся керамікай. Цяпер у мяне дзве Музы: жанчына і гліна.

ЛІТОЎСКІ КРАЙ АЗЁР

Літоўскі горад Уцена, дзе жыве каля 28 тысяч чалавек, мала вядомы беларусам. Знаходзіцца ён на адлегласці прыкладна 100 кіламетраў ад Вільнюса. На гербе горада — выява падковы.

Гэта адзін са старэйшых літоўскіх гарадоў, у летапісе згадваецца ў 1261 годзе. Назву атрымаў ад рэчкі Уценайтэ. Славутасць горада — самы стары ў Літве нацыянальны парк з лясамі і азёрамі, аўтэнтычнымі вёсачкамі. Дарэчы, ва Уценскім павеце каля 190 азёр.

Самы стары будынак гарадка — паштовая станцыя. Яна ўзведзена ў 1835 годзе, а яе адкрыццё адбылося з удзелам расійскага імператара Мікалая I і яго сына Аляксандра. У наш час там знаходзіцца экспазіцыя філіяла музея, якая расказвае пра дэпартацыю літоўцаў.

Дарэчы, з расійскім царом звязана гісторыя пра скаргу на мясцовага памешчыка Краўзэ. Апошні быў вельмі жорсткім чалавекам, здзекаваўся з прыгонных сялян, біў іх. Перад тым, як імператар прыехаў ва Уцену, салдату, які павінен быў стаяць на варце, даверылі перадаць скаргу. Той паклаў паперу ў форменную шапку. Так сталася, што Мікалай I выпадкова спыніўся менавіта каля гэтага салдата. Апошні ўпаў на калені і зняў шапку. Цар узяў скаргу і адразу прачытаў. Жорсткага памешчыка сваім распараджэннем выселіў...

Керамікі шмат і на вуліцах Уцены, і ў мясцовым краязнаўчым музеі. У апошнім ёсць таксама і багатая калекцыя твораў майстроў разьбы па дрэве XVII—XIX стагоддзяў.

Праект «Музейныя вароты» вылучыў Уценскаму краязнаўчаму музею 70 тысяч еўра для афармлення залы, прысвечанай гісторыі горада. Дзякуючы гэтым грашам, тут з'явіўся інтэрактыўны «электронны стол», які дазваляе ўбачыць, як мяняўся горад: якія тут з'яўляліся і знікалі дамы, як перабудоўваліся касцёлы, якія працавалі прамысловыя прадпрыемствы...

Сярод 85 тысяч экспанатаў ёсць і прысвечаныя савецкаму часу. Напрыклад, плакаты-«справаздачы» пра тое, як паляпшаўся ўзровень жыцця, «тыповы» прадуктовы набор...

Цяпер тут мала што нагадвае савецкае мінулае. На вуліцах не ўбачыш помнікаў Леніну, не засталося тагачасных назваў вуліц. Але нечакана я ўбачыў проста пад нагамі... крышку ад люка, зробленую ў Літоўскай ССР...

Пра тое, як калісьці выглядалі літоўскія хутары, можна атрымаць уяўленне ў этнаграфічнай сядзібе братоў Мішкіняй.

НА ПАЛЯХ ПРЭС-ТУРА...

Перад паездкай у Літву музейныя супрацоўніцы запыталі, што мне было б цікава ўбачыць. Цытуючы словы героя фільма «Дэжа вю», я пажартаваў: «бокс, секс, джаз». Але ў адказ пачуў сур'ёзнае, што апошняга з пералічанага больш няма. Аказалася, што мясцовы музычны гурт забаронены за радыкалізм... Затое ва Уцене ёсць музычны фантан на маляўнічым возеры Даўнішкіс.

Не знайшоў я тут і марак (мой сын збірае) на мясцовай пошце, куды адвёў мяне літоўскі калега. Літоўскія еўраскептыкі скардзіліся на тое, што няма больш нацыянальных банкаў, а вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі плацяць, каб... не аралі і не сеялі. Шмат моладзі пакідае краіну ў пошуках лепшай долі ў больш багатых краінах ЕС.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Уцена—Полацк—Віцебск.

■ Святло ў акне

ЛЮБОЎ ЖЫВЕ ВЕЧНА, калі людзі цікавыя адно аднаму

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Таццяна Іёнаўна Пятрова і Мікалай Пятровіч Шаліма — прыгожая сямейная пара, якая 6 жніўня зладзіць «залатое» вяселле. Як пабудаваць паспяховую кар'еру, стварыць шчаслівую сям'ю і пажылы век успрымаць як падарунак лёсу — пра гэта наша гутарка.

— Расказваюць, што гісторыя вашага знаёмства вельмі незвычайная...

Мікалай Пятровіч (М.П.) — Гэта быў 1965 год. Я вучыўся на юрфаку БДУ і ў першы дзень заняткаў пасля канікул убачыў у холе насценгазету — мяне прыцягнула фатаграфія дзяўчыны, якая заблыталася ў стропах парашута. Кажу аднакурснікам: «Якая цікавая дзяўчына, хачу пазнаёміцца». Праз два дні я прыйшоў да яе на кватэру.

Таццяна Іёнаўна (Т.І.) — Я вучылася на журфаку, і ў мяне было заданне: зрабіць інтэрв'ю з парашутыстамі. Вырашыла не абмяжоўвацца гутаркай, а скокнуць, каб зразумець стан сваіх герояў. Прызнаюся, баялася, але скокнула. А потым, вядома, выпусцілі насценгазету, а ў ёй — сяброўскі шарж. А далей было так: у мяне дома разам з сяброўкай рыхтаваліся да палітэканоміі. Прыйшоў малады чалавек і вельмі добра патлумачыў нам тэму. Потым сяброўка Ніна кажа мне: «Добры хлопец, трэба браць».

— Таццяна Іёнаўна, многія памятаюць праграму на беларускім радыё «Рамантыкі». А яшчэ вы вялі клуб «Рэпарцёр», з якога выйшлі цяперашнія зоркі журналістыкі Ягор Хрусталёў, Алесь Кругляко-ў, Аляксандр Хабараў. Самая ж знакамітая ваша праграма — маральна-прававы канал па праблемах дзяцей і падлеткаў «Прэзумпцыя». Калі вы яе стваралі, Мікалай Пятровіч працаваў пракурорам Ленінскага раёна Мінска. Кажуць, што не без дапамогі мужа з'явілася такая перадача.

Т.І. — Ужо не адзін дзясятак гадоў апраўдваюся: удзел Колі тут мінімальны. Вядома, калі рыхтавала першыя выпускі, то раілася з ім па юрыдычных пытаннях. Раз, два ён мог дапамагчы мне запрасіць эксперта, нешта падказаць, але не ўвесь жа час... Хоць на радыё і быў такі пасыл, маўляў, у цябе муж юрыст, вось і будзеш рабіць. Аналагаў гэтай перадачы не было ва ўсім Савецкім Саюзе.

«Прэзумпцыя» стваралася ў час перабудовы, калі ўжо было можна ўздымаць вострыя тэмы. Але ніякіх пастановачных спраў — толькі рэальныя дзіцячыя лёсы. Я заўсёды выступала ў ролі адваката: самае «цяжкае» дзіця было пад маёй абаронай. Тады і цяпер пераканана: у дзіцячых бедах вінаваты бацькі, грамадства.

— Праца журналіста і пракурора — гэта ненармаваны працоўны дзень. Хто вам дапамагаў выхоўваць сына?

М.П. — Самі спраўляліся. Бывала, Таня ў камандзіроўцы, я адвяду Сяргейку ў садок, а забіралі яго суседзі. Калі я на здарэнні, то прыязджаў дадому часам і пад раніцу. Уначы маглі выклікаць. Мы лічылі гэта нормай нашага жыцця.

Т.І. — Калі Сяргейка стаў школьнікам, брала яго ў камандзіроўкі, асабліва калі яны планаваліся ў рэгіён з гістарычна-архітэктурнымі славутасцямі. Ён тусаваўся разам з дзецьмі з клуба «Рэпарцёр». Калі маленькі Сярожа прыдумляў казкі, то падпісваўся — пісьменнік С. Шаліма. Была ўпэўнена, што сын пойдзе вучыцца на журфак.

М.П. — Сын вучыўся ў 9 класе, і я спытаў: «Сярожа, ты вызначыўся з прафесіяй?» Ён адказвае, маўляў, ты мне падкажы. «Не, вырашай сам, каб потым не ўпікаў мяне», — так я адказаў. Сярожа выбраў юрфак, а потым адвакацкі шлях. Да таго часу і я ўжо быў старшынёй Мінскай абласной калегіі адвакатаў...

— Таццяна Іёнаўна, калі дазволіце, спытаю пра здароўе, ведаю ад агульных знаёмых, што вы перанеслі некалькі аперацый і адну з іх на сэрцы...

Т.І. — Так, па аперацыях я выканала і перавыканала план. Цяпер лячуся спевамі. Чатыры гады назад пачала браць урокі ігры на гітары і ўжо выступаю з невялікімі хатнімі канцэртамі для сяброў. І яшчэ мяне выдатна лечыць біятлон — я фанатка гэтага віду спорту. Нават з лякарні прасіла выпісаць датэрмінова, каб глядзець трансляцыі са спаборніцтваў.

— А па працы не сумуеце?

Т.І. — Ёсць крыху. Мяне і запрашалі: голас жа не пастарэў. Але, па-першае, у мяне непрацоўная група інваліднасці. Па-другое, на пенсіі беспрацоўнай сябе не адчуваю! Гэта пакуль ты ходзіш на работу, ёсць адгаворка — няма калі. А цяпер: спевы, кнігі, біятлон, лецішча, сустрэчы з сябрамі, хатнія справы. Гэта ж вялікі падурунак лёсу, што ў мяне ёсць на гэта час. Мы ўсе заядлыя грыбнікі, а ўнучка Света — проста чэмпіён! На лецішчы працуем без фанатызму: не магу сёння, значыць, дапалю градку заўтра. Прыязджаем толькі на выхадныя. Галоўнае прызначэнне лецішча — збіраць сяброў. Раней мы шмат падарожнічалі па Еўропе, цяпер асцерагаюся далёка з'язджаць. А па Беларусі на экскурсіі ездзім часта.

М.П. — Рады, што па-ранейшаму запатрабаваны як спецыяліст. Ганаруся, што цяпер, калі кажуць «адвакат Шаліма», людзі пытаюць: «Які: малодшы ці старэйшы?»

— Мікалай Пятровіч, вы заўсёды займаліся грамадскай дзейнасцю. На працягу 29 гадоў былі членам прэзідыума Мінскага абкама прафсаюзаў работнікаў дзяржорганаў, ваша імя занесена ў Кнігу Пашаны Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў дзяржустаноў, вялі сатырычна-прававую рубрыку ў часопісе «Вожык», з'яўляецеся сузаснавальнікам мінскага «Ротары клуба», а цяпер і ў Мінскім сходзе нашчадкаў шляхты і дваранства сузаснавальнік і другая асоба. Вось пра дваранскія карані хацелася б падрабязней даведацца.

М.П. — Гэта выпадковасць. Неяк Таццяна так сябе паводзіла, што я ў гутарцы сказаў: «Ну, ты і пані». Жонка на поўным сур'ёзе: «Так. Мама казала, што ў нас дваранскія карані». Мне, зразумела, захацелася праверыць. Балазе, ужо прыйшоў той час, калі дваранскае паходжанне хаваць не было патрэбы. Распытаў у Тані прозвішчы продкаў і папрасіў свайго добрага знаёмага Ігара Чакалава-Шыдлоўскага праясніць гэта пытанне. Неўзабаве ён мне паведаміў, што Таніна мама з дваранскага роду. «Па маці ты — дваранка, а па тату — дварняк», — пажартаваў я тады. І падумаў: раптам памыляюся. Ізноў на дапамогу прыйшоў Ігар, і высветлілася, што з «дварняком» я паспяшаўся: мама і тата Таццяны з дваранскіх родаў Усевялікага Войска Данскога. Вырашыў, пара і пра сябе даведацца. Аказалася, што па матчынай лініі я належу да рыцарскага роду, вядомага з XIV стагоддзя. У 2009 годзе мы зарэгістравалі грамадскую арганізацыю Мінскі сход нашчадкаў шляхты і дваранства.

— Вы такія розныя па характары, тэмпераменце, і ўжо паўстагоддзя разам. У чым сакрэт сямейнага шчасця?

Т.І. — У нестарэючым каханні! У мяне эмоцый — цераз край. Нават часам дзіўлюся: як родныя мяне трываюць? Мікалай — такі вогнетушыцель у сям'і. І ўсё ж разам мы шчаслівыя.

М.П. — Не верце, калі кажуць, маўляў, каханне жыве тры гады. Яно можа жыць і 30, і 50 гадоў, калі людзі цікавыя адзін аднаму. Я часам жартую: калі буду другі раз жаніцца, то толькі на глуханямой, але як толькі Таня легла ўбальніцу, дык я бег ад цішыні, якая акружыла мяне...

Т.І. — У рэанімацыі мне было вельмі дрэнна, у медыкаў гэта завецца «мы страчваем пацыента», але як толькі Мікалай з'явіўся на парозе, усе гэтыя прыборчыкі, да якіх мяне падключылі, у той жа момант пачалі паказваць добрую дынаміку.

Гутарыла Аксана ЯНОЎСКАЯ

■

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 27 (327)

■ Фестывалі

МЕРАЙ МАСТАЦКАГА ЭКСПЕРЫМЕНТА

У праграму форуму «Тэарт» сёлета ўключаны 22 пастаноўкі з 9 краін

І ёсць шанс заспець квіткі, хоць звычайна яны разыходзяцца хутка, асабліва на міжнародную праграму тэатральнага форуму, які сёлета пройдзе шосты раз.

ПРА НАС

Трэба сказаць, апошнія гады беларускі шоўкейс «Belarus Open» інтрыгуе не менш. Таму што ў сталіцы паказваюць тое найлепшае і неардынарнае, што з'яўляецца ў рэгіянальных тэатрах (а там віруе жыццё і працуюць асобы, якія час ад часу ўвасабляюць свае развагі ў самых нечаканых формах). З іх усё і пачнецца: 28 верасня беларускую праграму адкрые прэм'ера тэатральнага праекта, які аб'яднаў двух асоб з неардынарным поглядам на рэчы: артыстку і рэжысёра Святлану Бень і рэжысёра і драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага. Да іх далучыўся Валерый Воранаў, які стварыў музыку, — яна стане часткай дзеі пад назвай «З жыцця насякомых». Зразумець Багаслаўскага як рэжысёра можна будзе таксама падчас прагляду спектакля «Саша, вынесі смецце» (паводле Наталлі Варажбіт) Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. З самых гучных тэатральных падзей адборшчыкі звярнулі ўвагу на «Опіум», створаны рэжысёрам Аляксандрам Марчанкам пры фінансавай падтрымцы саміх гледачоў і арганізатарскай дапамозе Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн». Драматычныя спектаклі прыедуць з Магілёва — найперш маецца на ўвазе драма «Крэйцарава саната» ў пастаноўцы Саўлюса Варнаса ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры.

Гэтаму спектаклю па драматычным напружанні не саступае пастаноўка Ігара Казакова «На дне» (паводле М. Горкага) у Магілёўскім абласным тэатры лялек. Яна атрымалася правакацыйна-эмацыянальнай за кошт рэжысёрскага падыходу, калі лялькі ўзаемадзейнічаюць з людзьмі. Магілёўскі тэатр лялек такімі спектаклямі зацікавіў ужо не толькі беларускую тэатральную супольнасць. Наогул, лялечныя тэатры ў сучасным айчынным творчым працэсе вылучаюцца канцэптуальным поглядам на рэчаіснасць, калі нават творы з мінулага гучаць незвычайна пранікнёна за кошт асаблівай падачы і формы. Таму не трэба дзівіцца, што ў беларускай праграме «Тэарта» пастановак лялечных тэатраў некалькі. Гэта «Фро» (А. Платонава) Брэсцкага тэатра лялек ад расійскага рэжысёра Руслана Кудашова. Хто не паспеў паглядзець гэта падчас Мінскага міжнароднага фестывалю лялечных тэатраў, мае цудоўны шанц падчас «Тэарту» далучыцца да высокага мастацтва ад лаўрэата прэміі «Залатая маска». І калі ўжо пайшла такая гаворка — то ёсць і наш унёсак у Расійскую нацыянальную тэатральную прэмію. Сёлета яго зрабіў рэжысёр Аляксей Ляляўскі. Фестываль звяртае ўвагу на яго пастаноўкі ў айчынных тэатрах: «Візіт старой дамы»(паводле Ф. Дзюрэнмата) у Гродзенскім абласным тэатры лялек, «Птушкі» ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек — размова на вельмі актуальную тэму ўладкаванасці грамадства на падставе п'есы Арыстафана.

Таксама пра нас: «Час сэкандхэнд» паводле Святланы Алексіевіч ад Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, толькі ў пастаноўцы Уладзіміра Пятровіча. Яшчэ адну беларускую кнігу «Беларусь 4:33. Горад сонца кропка нуль» з ідэямі Артура Клінава прадстаўляюць у адмысловым праекце Таццяна Арцімовіч і Антон Сарокін. Небанальны падыход да пастаноўкі з пункту гледжання формы — гэта яшчэ і перфоманс «Прадметная размова» рэжысёра Вольгі Сарокінай. Але перфомансу ў беларускім тэатры будзе прысвечаны асобны вечар. І яшчэ адзін вечар з беларускай тэмай — «Дзяды» Міцкевіча, на гэты раз ад Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы (сумесная беларуска-польская пастаноўка рэжысёра Паўла Пасіні).

ДЛЯ НАС

Беларуская частка пачынае. Працяг забяспечваюць госці. Сярод іх ёсць тыя, каго ўспрымаюць амаль як сваіх — напрыклад, Оскараса Каршуноваса (не толькі таму, што ў яго ёсць беларускія карані). Яго спектаклі, колькі б ні прывозіліся, заўсёды праходзяць з аншлагамі. А сёлета ў спектаклі «Апошняя стужка Крэпа» (паводле С. Бекета) Вільнюскага гарадскога тэатра заняты да таго ж легендарны артыст Юозас Будрайціс.

Таксама расійскія пастаноўкі традыцыйна выклікаюць увагу айчыннага гледача. А цяпер ажыятажу, відаць, не пазбегнуць: Маскоўскі драматычны театр імя А. С. Пушкіна прывязе пастаноўку, што сёлета зрабіла фурор на Венецыянскай біенале. Спектакль «Мера за меру» (паводле Д. Данелана) створаны сумесна з брытанскай тэатральнай кампаніяй «Cheek by Jowl». Плюс пазнавальны і любімы акцёр Аляксандр Фяклістаў у галоўнай ролі. Сузор'е артыстаў прыедзе з Санкт-Пецярбурга: іх сабраў рэжысёр Юрый Бутусаў у спектаклі «Горад. Жаніцьба. Гогаль», за што атрымаў тэатральную прэмію «Залаты Сафіт». Ёсць магчымасць убачыць на сцэне Ганну Кавальчук разам з іншымі артыстамі (спектакль быў адзначаны той жа пецярбургскай прэміяй яшчэ і за акцёрскі ансамбль).

Сусветная класіка ў тэатры — найперш «Уільям наш Шэкспір». «Трагедыю Макбета» пабачым у інтэрпрэтацыі Ігара Пізона і Нацыянальнага славенскага тэатра. Нямецкі тэатр прадставіць пастаноўку паводле Хайнера Мюлера «Місія. Успаміны аб адной рэвалюцыі» (гэта трэба паглядзець, нібыта адмыслова для нас). Трагедыі людзей, што жывуць цяпер, прыцягваюць Карнэля Мудруца з Венгрыі. Аб праблемах асаблівых людзей разважае ён у спектаклі «Дзменцыя». І гэта, аказваецца, можна рабіць у форме мюзікла. Музыка наогул дае сучаснаму тэатру падставы для эксперыментаў. Па-першае, каб пагаварыць пра каханне, што прадставіць тэатр з Лазаны ў спектаклі «Кінг сайз». Па-другое, пра саму музыку, як у спектаклі «Шапэн без фартэпіяна» Варшаўскай тэатральнай кампаніі CENTRALA.

З музыкі міжнародная частка і пачнецца: Нацыянальны харэаграфічны цэнтр Ла-Рашэлі парапануе нам пашукаць «Карані». Тыя, хто асабліва цікавіцца «Тэартам», ведаюць, што ў праграму выбіраецца найлепшае з магчымага.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Вернісаж

СІЛА ПРЫЦЯГНЕННЯ

Музей імя Станіслава Жукоўскага як вынік пленэру

Калі гаворка заходзіць пра пейзажны жывапіс канца XIX — пачатку XX стагоддзя, успамінаецца імя мастака, акадэміка Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў Станіслава Жукоўскага, які развіваў традыцыі лірычнага пейзажа і дасягнуў вялікага поспеху ў сядзібна-пейзажным жанры. Сёлета спаўняецца 140 гадоў з дня нараджэння мастака. З гэтай нагоды ў галерэі «Універсітэт культуры» адбылося адкрыццё выстаўкі па выніках Міжнароднага пленэру жывапісу памяці майстра.



Алена Вяземская (Масква). «Прагулка ў бярозавым гаі».

Адкрыццё пленэру адбылося яшчэ летась на базе сядзібы «Жураўлінае», непадалёк ад якой нарадзіўся Станіслаў Жукоўскі (на жаль, родная хата майстра не захавалася да нашых дзён), і Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу. Арганізаваны пленэр мастацкім аб'яднаннем «Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)». Пленэр аб'яднаў мастакоў, не абыякавых да творчасці майстра, якія ўзялі за мэту адраджэнне лірычнага пейзажа і інтэр'ернага жанру мастацтва. У праекце ўзялі ўдзел мастакі з Беларусі, Расіі, Узбекістана і іншых краін, а таксама музыкі, спевакі, паэты.

За час пленэру мастакі стварылі каля трохсот работ, лепшыя з якіх былі прывезены для экспанавання ў Мінск. Карціны ў стылі Жукоўскага абуджаюць пачуццё гармоніі, спакою. Неверагодныя пейзажы, інтэр'еры беларускіх хат, сядзіб. Творцы з Расіі і Узбекістана, якія прыехалі ў Мінск для адкрыцця выстаўкі, адзначылі, што беларуская прырода валодае моцнай прыцягальнай сілай, яна зачароўвае настолькі, што прысвячаць ёй творы — сапраўдная асалода.

Сяргей Цяслюк (Масква). «Цёплы вечар. Рака Мухавец».

Асобнымі аб'ектамі натхнення для мастакоў сталі Нясвіжскі, Мірскі замкі, Ружанскі палац, Белавежская пушча і азёры ў Брэсцкай вобласці. Выявы замкаў у экспазіцыі сустракаюцца не аднойчы: удзельнікі пленэру прапаноўваюць зірнуць на беларускую спадчыну з абсалютна розных ракурсаў. Кампазіцыі інтэр'ернага жанру на выстаўцы не шмат, але ж большасць з прадстаўленых дэманструе ўнутранае ўбранства замкаў. Вікторыя Алфяронак, мастачка з Віцебска, у прывітальным слове адзначыла, што калі аўтарам з іншых краін цікава знаёміцца з беларускімі краявідамі, то айчынным творцам прыемна акунуцца ў творчы працэс, адлюстраваць і гісторыю, і сучасны стан аб'екта ці краявіду.

Дарэчы, удзельнікі пленэру плануюць стварыць у Пружанскім раёне мемарыяльны музей імя Станіслава Жукоўскага, асновай якога стануць прадстаўленыя на выстаўцы работы.

Экспазіцыя працуе да 7 жніўня ў галерэі «Універсітэт культуры».

Вікторыя АСКЕРА

■ Сведчанні з архіва

КІНАЛЕТАПІС 80-х

«Цікава паглядзець, якія шапкі тады насілі»

У характарыстыцы 1981 года, з якім нас і нашых сучаснікаў раздзяляе трыццаць пяць гадоў, можна бясконца называць знакавыя гістарычныя факты. Пачатак прэзідэнцтва Рональда Рэйгана ў ЗША; разбіты Ту-104 пад Ленінградам, у якім загінула кіраўніцтва Ціхаакіянскага флоту СССР; замах на жыццё Папы Рымскага Яна Паўла II у Рыме; запускі савецкіх касмічных караблёў Саюз Т-4, Саюз-39 і Саюз-40; вяселле Дзіяны Спенсер і Прынца Уэльскага Чарльза, забарона рабства ў Маўрытаніі, забастоўкі і крызіс у Польшчы... Пра мінуўшчыну, хоць і не больш як стадваццацігадовую, мы можам даведацца і праз кінаэкран, а ён дае нам больш грунтоўныя рэсурсы, чым самае красамоўнае апісанне фактаў. Па дакументалістыцы, што здымалася ў гэты час у Беларусі, бачна, чым жыла і ганарылася краіна, якія думкі ўзнікалі ў людзей, што для іх было важна, — адчуваецца «дух эпохі». Тут гістарычныя моманты, «гарачыя» пацалункі палітыкаў (дадуць фору пацалунку Брэжнева і Хонэкера), знянацку знятая заклапочанасць на твары, норкавыя шапкі як знак небывалай раскошы, і нават лёгкі эратызм.

Дакумент часу

Ці сапраўды відэакантэнт валодае такімі шчырасцю і прамалінейнасцю? У дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў у Дзяржынску я прагледзела (у прамым сэнсе слова некалькі стужак) 1981 года. Тут захоўваюцца паўнавартасныя дакументальныя карціны, летапісны матэрыял, урыўкі, што не ўвайшлі ў кінаработы, — каля 1300 найменняў. Не толькі фільмы, кожны з гэтых непрыстроеных кавалкаў з'яўляецца для сённяшняга чалавека важным дакументам часу.

У дакументальным кіно таго часу спалучаецца натхнёны пафас маторабудаўнікоў, якія рапартуюць: «Няхай жыве гераічны рабочы клас саветаў!», і ўвага да тонкасцяў пяшчотнага, глыбокага, але і самадастатковага чалавека.

Часта ў карцінах таго перыяду відавочная прысутнасць ідэалагічнага ўздзеяння, але нават кінематаграфічны фальш дазваляе рабіць пэўныя высновы. Дакументальны фільм «Трыумф волі» Лені Рыфеншталь, які здымаўся па заказе Адольфа Гітлера і пра Гітлера (кананічным стаў ракурс кінакамеры, што глядзіць на фюрэра знізу, узвышаючы яго над іншымі людзьмі да ўзроўню ці не паўбога), вядома ж, прасякнуты адпаведнай сістэмай поглядаў, на сёння ўжо развенчанай. Але, нягледзячы на гэтую падсістэмнасць, «Трыумф волі» цікавы сучаснаму гледачу як дакумент, візуалізацыя, знак эпохі.

Цэнзура не перашкаджала і беларускім рэжысёрам і аператарам фіксаваць на стужцы вобразы людзей і іх характары, стройнасць парадаў і эмацыйнасць выступленняў, паўсядзённасць, стыль і побыт савецкага чалавека — перадаваць саму тэкстуру таго жыцця. І чаго не адымеш: пласт дакументальнага кіно дазваляе ўбачыць, што цікавіла дзяржаву, аўтараў і гледачоў, што лічылася важным і, нарэшце, што і як адбывалася ў краіне.

Нашым адрасам тады яшчэ быў Савецкі Саюз. Таварыш Леанід Брэжнеў, парады, з'езды, дэлегацыі, заводы, ураджай бесперапынна мільгалі ў так званых кіначасопісах «Савецкая Беларусь» студыі «Летапіс» Беларусьфільма. Кіначасопісы складаліся з некалькіх сюжэтаў і манціраваліся пад аповед дыктара з характэрна цвёрдым, выразным, з упэўненасцю ў будучыні, мужчынскім голасам.

Часопіс на экране

Менавіта аператары-летапісцы зафіксавалі для кіначасопісаў XXVI з'езд кампартыі, які адбыўся ў 1981 годзе ў Маскве, і дэлегатаў, што тут прысутнічалі (увогуле іх было амаль пяць тысяч, але не ўсім пашанцавала трапіць у кіначасопіс). Адзін з фільмаў пачынаецца на мінскай плошчы імя Леніна, а камера спыняецца на помніку яму. Пад гукі юных барабаншчыкаў тут праходзіць парад да 64-й гадавіны «Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Камандуючы парадам — генерал-палкоўнік Семярэнка. Прымае парад генерал арміі Іваноўскі. Пафасу ў такіх фільмах, як і на парадах, хоць адбаўляй. «Ідуць нашчадкі славы бацькоў», «сімвал бязмернай адданасці партыі, народу, радзіме», «несакрушальны маральны дух савецкага воіна», «з імем Леніна ў сэрцах і справах»...

Гэты стыль нязменны для фільмаў-выхвалянняў. Тут гаворка ідзе пра паспяховую беларускую вытворчасць альбо збор ураджаю, пра стаханаўскія подзвігі і планы пяцігодкі, пра будаўніцтва новых аб'ектаў і замежныя дэлегацыі. «Значна больш, чым у мінулым годзе, нарыхтавана бульбы», — расказвае дыктар. «На ўсіх кантынентах вядомыя беларускія аўтамабілі, — рапартуе голас у тэме зборкі двухмільённага рухавіка на БелАЗе і распрацоўкі новага, больш магутнага. — Новы беларускі самазвал стане яшчэ адным пасланцом дружбы на дарогах планеты».

На перадавой не толькі вытворчасці, але і кіначасопіса апынуліся стаханаўцы-1981. Два токары Мінскага станкабудаўнічага завода «Камінтэрн» за пяцігодку выканалі дзевяць і дзесяць гадавых нормаў. А прадукцыя Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі «ідзе ў 45 краін свету».

Летапісцамі зафіксавана, як, словамі дыктара, «забіваецца першая свая ў мінскім метро», якое ў 1981-м яшчэ толькі будавалася. Гаворка ідзе пра станцыі «Парк Чалюскінцаў» і «Маскоўская». Глядач можа патрапіць на будаўнічую пляцоўку метрапалітэна, якім сёння карыстаецца, і ўбачыць людзей, што ўдзельнічалі ў яго стварэнні. «Побач з ветэранамі падземных магістраляў беларуская моладзь». Моладзь у касках, адпачываючы ля сцяны калектара, усміхаецца.



Фільмы кшталту кіначасопіса «Савецкая Беларусь» не прайшлі бясследна — вялікая і цікавая ад іх пераемнасць адчуваецца на сённяшнім тэлебачанні. Падчас прагляду стужак таго часу па ўспрыманні «б'е» пазнавальны пафас савецкай дактрыны (кіначасопіс мог завяршыцца прачытаннем верша са згадкай імя Леніна).

Але ёсць нешта ў дакументалістыцы таго часу, што не проста з'яўляецца нейкай асаблівасцю, але і сведчыць пра сапраўды іншае светаўспрыманне і адрознае ад сённяшняга стаўленне да жыцця. Савецкі пафас ідзе поруч з сентыментальнасцю. У кіно бачныя пяшчота да навакольнага свету, імкненне ва ўсім знайсці падставу для стварэння чуллівых сцэн, увага да эмацыйных праяў. Нават дзіўна, але эмоцый у гэтых фільмах сапраўды шмат, хоць, на першы погляд, здаецца, што кінематаграфісты спрабуюць падгарнуць персанажаў пад нейкую мадэль савецкага чалавека, адрэтушаваць, стварыць зададзены, а не рэальны чалавечы вобраз.

Сантыменты ў студыю

Буйныя планы, асабістыя развагі (у адказ на шчырыя пытанні), назіранні за тварам чалавека, скопленыя каларытныя моманты. У стужцы «Штрыхі да партрэта дзелавой жанчыны» ўсё гэта ёсць. Да таго ж ёсць лёгкая, вельмі асцярожная нотка эратызму. Дзяўчына накідае на сябе пеньюар, у наступным пасля плану туманнай набярэжнай папраўляе валасы... Выглядае прыгожа і ў тэму.

Дзелавыя жанчыны, што сталі гераінямі фільма, працуюць на Віцебскай фабрыцы КІМ, якая займаецца трыкатажам і панчохамі. Зразумела, чаму дзелавых вырашылі здымаць тут (хаця, хутчэй за ўсё, тэма з'явілася пасля ідэі стварыць карціну пра віцебскую фабрыку): у штаце КІМа працуюць пераважна асобы слабога полу.

На ранішняй планёрцы жанчыны рассаджваюцца за сталом, а мужчыны прымошчваюцца на крэслах ўздоўж сцяны (як у некаторых культурах, дзе жанчынам нельга садзіцца за стол, — толькі наадварот).

Хаця ў гэтым выпадку ён нагадвае суполку амазонак ці гаспадарань свету: на ранішняй планёрцы жанчыны рассаджваюцца за сталом, а мужчыны прымошчваюцца на крэслах уздоўж сцяны (як у некаторых культурах, дзе жанчынам нельга садзіцца за стол, — толькі наадварот). Вакол слоў «дзелавая жанчына» тут круціцца ўсё і пытанні інтэрв'юера таксама. У дыялозе адна з супрацоўніц фабрыкі расказвае, як яе сын папрасіў маму памяняцца работай з татам, каб яна сама магла забіраць яго з садка. У шэрагу інтэрв'ю я ўбачыла разумных, сціплых, разважлівых асоб з пачуццём уласнай годнасці. І мне падабаюцца

Савецкая цэнзура не перашкаджала беларускім рэжысёрам і аператарам фіксаваць на стужцы вобразы людзей і іх характары, стройнасць парадаў і эмацыйнасць выступленняў, паўсядзённасць, стыль і побыт савецкага чалавека.

гэтыя людзі. Дарэчы, апроч асабістых якасцяў, тут, як і ў любой іншай дакументалцы, бачны рэчавы вобраз эпохі: на галовы жанчын, што вяртаюцца пасля працы дадому, насунутыя норкавыя шапкі, якія дзяржынская кінааператарка адзначыла асобна.

За персанажамі назіраць сапраўды прыемна, як цікава заўважаць дробязі ў любым чалавеку. Камера з гэтым згодная, таму аўтары часта будуюць сцэны такім чынам, каб за сябе гаварыў кожны мускул твару. У карціне «Роздум» пра вучонага-селекцыянера Пятра Альсміка аператар канцэнтруецца на жонцы галоўнага героя: «Наогул кажучы, жывём маркотна». Словы гучаць так шматзначна ў кантэксце аповеду пра плённую і важную шматгадовую працу Пятра Іванавіча, пра пошукі ідэальнага гатунку бульбы. Усё — айчыннай навуцы, нічога — сабе.

У дакументальным кіно таго часу спалучаецца натхнёны пафас маторабудаўнікоў, якія рапартуюць: «Няхай жыве гераічны рабочы клас саветаў!», і ўвага да тонкасцяў пяшчотнага, глыбокага, самадастатковага чалавека. Трывалае падпарадкаванне ідэалогіі і жаданне вывесці на першы план эмоцыю.

У 1981 годзе кіналетапісцамі былі зафіксаваныя Іван Шамякін, Ніл Гілевіч, Янка Брыль, меліяратыўныя працы, Марш міра, выступы Леаніда Брэжнева, візіты Міхаіла Гарбачова ў Беларусь (выявы на кукурузным полі), сустрэчы ветэранаў. І, як ужо гаварылася, сама структура таго жыцця, на што здольнае толькі кіно. Перад скрынкамі са стужкамі, што захоўваюцца ў архіве кінафотафонадакументаў, адчуваеш пэўнае хваляванне, і перад якасцю вызявы (прыемнай, як неадбеленая папера ў сшытку) — таксама.

Функцыю кіначасопісаў сёння пераняло тэлебачанне. Другі кірунак, больш тонкі і няўлоўны, застаецца за кінадакументалістыкай. Кожны эпізод у неігравым кіно мінулых часоў здольны ў некага выклікаць настальгію, а некаму раскрыць іншы свет. Кожны метр стужкі варта берагчы як зрэнку вока.

Праз 35 гадоў беларусы захочуць паглядзець на экране дакументальныя карціны за 2016 год. Што яны ўбачаць?

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Кінакрокі

СФАРМІРАВАЦЬ І РАЗВІЦЬ

Індустрыя кіно ў Беларусі мае быць

Каардынатар Індустрыяльнай платформы Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» Лізавета Бобрыкава з праектам «Bel:Cinema» (Belarus Empowerment Lab:Cinema) накіруецца ў Школу кінаагентаў SOFA і прыме ўдзел у яе чацвёртай майстэрні. З дапамогай ментара і міжнародных кансультантаў тут будзе распрацавана сістэма мер для ажыццяўлення новага праекта.

Ініцыятыва «Bel:Cinema» прапануе стварыць унікальны цэнтр для спецыялістаў сферы кінематографа, якія павінны на працягу года разам з кураторамі распрацаваць шэраг праектаў. Увасобленыя на практыцы, тыя мусяць дапамагчы сфарміраваць у Беларусі паўнавартасны кінарынак, унутры якога асобным прадстаўнікам сферы будзе зручна кантактаваць. Прафесіяналы кіно, што прымуць удзел у майстэрні SOFA, будуць дапамагаць давесці праект «Bel:Cinema» ад ідэі да запуску.

«Я буду прэзентаваць першы крок «Bel:Cinema», які накіраваны на развіццё індустрыі кіно ў нашай краіне, — рабочую лабараторыю для актывістаў кінасферы, — каментуе Лізавета Бобрыкава. — Праблема ў тым, што ў нас ёсць кінафестываль, асобна ёсць незалежныя рэжысёры, некалькі прадзюсараў (літаральна 2-3) і кампаніі, якія здымаюць розны кантэнт (ад рэкламы да кароткага метра). Гэтыя часткі, на жаль, не звязаныя паміж сабой, да таго ж не хапае адзінай базы і вопыту для міжнароднага супрацоўніцтва. Каб вырашыць гэтыя пытанні, я хачу сабраць ініцыятыўную групу, якая атрымае веды і вопыт па цікавых для іх тэмах (напрыклад, прадзюсіраванне, дыстрыбуцыя, міжнародныя стасункі), а потым выкарыстае гэтыя веды для наладжвання структуры і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў краіне і за мяжой. Гэта стане яшчэ адным крокам у стварэнні кінаіндустрыі, што дапаможа развівацца, знаходзіць фінансаванне і ўвасабляць свае ідэі маладым і не толькі маладым рэжысёрам, прадзюсарам і іншым кінадзеячам у Беларусі».

Майстэрня Школы кінаагентаў SOFA будзе праходзіць з 19 да 28 жніўня ў культурнай сталіцы Еўропы гэтага года — Вроцлаве.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

ШЧАСЦЕ — У ДРОБЯЗЯХ

Такой жыццёвай філасофіі прытрымліваецца мастак з Віцебска, які марыць стварыць музей у чамадане

Упершыню я ўбачыла Яўгена Кутаркіна на «Млыне» (сталічны кірмаш вырабаў ручной працы. — Аўт). Уразіў ён мяне тады найперш сваім дзіўным галаўным уборам. «Гэта шлемафон, — задаволіў цікаўнасць малады чалавек. — У такім лётчыкі звычайна лётаюць, таму ён мае павышаную шумаізаляцыю. Я ў ім таксама перыядычна працую, бо гэта вельмі зручна і практычна. Напрыклад, падчас фестывалю, калі даводзіцца выстаўляць свае інсталяцыі побач са сцэнай, ён дапамае не аглохнуць ад гучнай музыкі. Ды і ад ветру засцерагае». У гэты момант мая ўвага са шлемафона пераключылася на незвычайную канструкцыю побач з Яўгенам — у аснове якой лінза, трынога і бляшанае вядро. Вось зрабіў «Машыну часу», — сціпла прамовіў мастак і запрасіў завітаць у «Арт-прастору на Талстога, 7». І вось я ў музеі альтэрнатыўнага сучаснага мастацтва — адным з найцікавейшых месцаў Віцебска. У адной з залаў мяне сустракае Яўген са сваёй, ужо ўдасканаленай, «Машынай часу» і... процьмай маленькіх прадметаў з гліны — чаго тут толькі няма: і каструлі, і радыёпрыёмнікі, і прасы, і швейныя машынкі, і заварнікі, і кававаркі...

«Тата — мой налепшы студэнт»

«А дзе такі можна купіць? — паказвае на малюсенькі чайнічак турыстка са Шчучына. — Я сваёй дачцэ хацела б сувенір прывезці з Віцебска». — «Вазьміце — дару», — усміхнуўся Яўген. І расказаў, што якраз цяпер афармляе вітрыну будучай крамы, у якой можна будзе набыць у тым ліку і яго мініяцюрную кераміку. «Людзі, якія прыходзяць у «Арт-прастору», часта хочуць нешта забраць на памяць. Таму мы вырашылі даць ім такую магчымасць: зрабіць невялічкую краму-галерэю, дзе можна набыць асобныя вузлы і элементы работ тых творцаў, якія з доўгатэрміновымі экспазіцыямі працуюць у Мінску на Талстога, 7».

Яўген «варожыць» над сваёй «Машынай часу».

Да такога экзатычнага занятку, як выраб мініяцюрных прадметаў з гліны, Яўген прыйшоў не адразу. Пасля заканчэння ўніверсітэта імя П.М. Машэрава выкладаў кераміку ў прафесійна-тэхнічным каледжы. «Нават брата там вучыў, але ён цяпер творчасцю асабліва не займаецца. Затое тата вельмі сур'ёзна заняўся керамікай: засвоіў камінныя гадзіннікі і падлогавыя вазы. Ён мой найлепшы студэнт *(смяецца)*. Праз два гады выкладання я вырашыў распачаць сваю справу».

Доўгі час мастак спецыялізаваўся на буйной інтэр'ернай кераміцы. Рабіў дэкаратыўныя талеркі ды гадзіннікі з гравіроўкай архітэктурных славутасцяў. Каля 150 розных выяў было: усе абласныя гарады Беларусі, Пецярбург, Масква, Калінінград, Чыкага, Лас-Вегас... «Усё рабіў уручную з дакладнай дэталіроўкай. Калі іншыя пачалі выкарыстоўваць лазерную гравіроўку, кінуў гэтую справу: які сэнс канкурыраваць з камп'ютарам, дзе любая графічная выява выконваецца за лічаныя хвіліны? У выніку пераключыўся на мініяцюрную кераміку. І ведаеце, сёння мае сантыметровыя работы ўражваюць людзей не менш, чым вялікія метровыя рэчы».

Чайнік памерам з запалкавую галоўку

А пачалося ўсё з захаплення антыкварыятам. Яўген часта заходзіў у антыкварныя крамы і бачыў там шмат прадметаў, якія не заўсёды мог сабе набыць. «Грошы патрэбныя былі на іншыя рэчы. Ды і ставіць тыя рарытэты насамрэч не было куды. Таму я і пачаў рабіць маленькія копіі таго, што мне падабаецца, у рэтра-стылістыцы. Мала таго, што людзі ў захапленні, дык гэта яшчэ і тэхналагічна зручна. Дастаткова 200 грамаў гліны ў кішэні, каб зрабіць дзясятак мініяцюр. Да таго ж іх можна выконваць у любым месцы, без спецыяльна абсталяванай майстэрні. Абпальваюцца мініяцюры ў лабараторнай муфельнай печцы, якая спажывае электраэнергіі столькі, колькі звычайны прас. Яе лёгка можна пакласці ў машыну і з'ехаць працаваць за горад».

Маленькія рэчы з гліны выконваюцца пры дапамозе нажовачнага палатна, адточанага пад вуглом 45 градусаў, і звычайнай іголкі. Гэтыя немудрагелістыя інструменты дазваляюць прапрацаваць усе дэталі нават пяціміліметровага чайніка.

У калекцыі Яўгена Кутаркіна ўжо больш за 50 розных прадметаў побыту. Памер мініяцюрных твораў мастацтва — каля 2-3 сантыметраў. Самы маленькі керамічны чайнік, які вылепіў мастак (дзе выразна бачныя носік, крышачка, ручка!!!) — не большы за запалкавую галоўку. «Каб рабіць такія міліметровыя рэчы, трэба мець трывалую псіхіку, — кажа Яўген. — Больш за тое, гэта займае шмат часу, таму я зрабіў толькі некалькі штук, каб размясціць у экспазіцыі, для кантрасту. Аналагаў з чырвонай гліны ў такім маштабе і з такой дэталіроўкай я не ведаю. Сустракаў мініяцюры з фарфору, але яны выконваюцца заводамі, як правіла, для лялечных домікаў».

У кожнай мініяцюры Кутаркіна свой лёс. «Неяк мой добры сябар Раман Баярнцаў папрасіў зрабіць для яго набор прадметаў побыту — міні-патэльняў, чайнікаў ды іншага. Ён пры дапамозе іх стварыў макет для спектакля. Яго, дарэчы, зацвердзілі і паставілі на сцэне нашага тэатра імя Якуба Коласа. Ёсць людзі, якія калекцыянуюць мае мініяцюры. Мне прыемна, калі чалавек набывае іх для інтэр'еру і яны яго радуюць штодзень. Гэта лепш, чым калі б мая работа ляжала пад нейкім інвентарным нумарам у музеі».

Дарэчы, менавіта падчас работы над вітрынай будучай крамы «Арт-прасторы» (у афармленні мастак выкарыстаў павялічаную копію дарожнага чамадана) Яўгену ў галаву прыйшла цікавая ідэя: а чаму б не выкарыстаць чамаданную тэматыку і для сваёй мініяцюрнай калекцыі. «Я мару зрабіць кампактны музей, які можна было б перавозіць у чамадане з горада ў горад. Тым больш ужо праверыў, ён, двухметровы, якраз ідэальна змяшчаецца ў мікрааўтобус. Засталося толькі папоўніць калекцыю...»

Самы маленькі керамічны чайнік, які вылепіў мастак, не большы за запалкавую галоўку. Каб рабіць такія міліметровыя рэчы, трэба мець трывалую псіхіку.

Кожны расслабляецца па-свойму

А пакуль Яўген актыўна выкарыстоўвае сваю мініяцюрную кераміку ва ўласных інсталяцыях. У тым ліку і ў «Машыне часу». «Як і большасць творчых ідэй, «Машына часу» нарадзілася спантанна. Мой сябра Уладзімір Кадзетаў падарыў мне лінзу — яна выкарыстоўваецца для пайкі радыёдэталяў. На першы погляд, абсалютна ўтылітарная рэч, але, калі прыгледзецца, яна надзвычай арыгінальная па дызайне. «Я не ведаю, навошта яна табе, але адчуваю, спатрэбіцца». Так і сталася. Аднойчы я выйшаў у цэнтр горада, паставіў каля Ратушы барнае крэсла, на яго — вядро. Наляпіў туды свае мініяцюры з гліны, зверху прымацаваў тую лінзу, і сам сеў побач. Гэта канструкцыя выклікала жывы інтарэс. Не паверыце, да канца дня я прадаў усё разам з вядром. Цяпер, як бачыце, барнае крэсла замяніла трынога. Яна больш мабільная, лёгкая. Хтосьці, калі глядзіць на маю «Машыну часу», бачыць самагонны апарат, хтосьці касмічную станцыю, каму што бліжэй. Кожны выказвае сваё меркаванне, знаходзіць у гэтым нешта сваё. Я ж стараюся зрабіць, каб гэта было цікава і дзіцяці, і чалавеку за семдзесят. Апошнія, дарэчы, калі бачаць рарытэтныя друкавальныя машынкі ды радыёпрыёмнікі, настальгуюць, успамінаюць, што яны ў свой час карысталіся імі. І асацыятыўна пераносяцца ў той прамежак часу, які звязаны з гэтымі прадметамі, а значыць, і іх маладосцю. І радуюцца, як дзеці. Я імкнуся, каб мая інсталяцыя не толькі радавала, але і разам з тым наводзіла на нейкія філасофскія развагі. Шчасце ж яно насамрэч у дробязях, у простых рэчах. Інсталяцыя — гэта мой спосаб медытацыі. Кожны адпачывае па-свойму: хтосьці ідзе на рыбалку, хтосьці страляе вавёрак. Калі развешваю ўсялякія жалезкі і вёдры — у мяне расслабляецца мозг. Я раблю тое, што блізка мне, не імкнуся некага ў нечым пераканаць. Ёсць шэраг людзей, якім гэта таксама падабаецца».

Раней на незвычайныя ідэі, якія нараджаліся ў творчай галаве Яўгена Кутаркіна, можна было падзівіцца толькі час ад часу — на буйных фестывалях ды кірмашах. Цяпер для гэтага дастаткова прыйсці ў Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва. «Добрае памяшканне ў цэнтры горада — гэта вялікі падарунак для мастака. У «Арт-прасторы» можна выстаўляцца толькі пры ўмове, што гэта будзе цікава гараджанам і турыстам. Я вельмі ўдзячны за давер дырэктару цэнтра Андрэю Духоўнікаву, які падтрымлівае ўсе мае ідэі. Акрамя экспазіцыйнай залы, ён мне прапанаваў аформіць на свой густ дворык перад уваходам у музей. Падарожнічаючы па розных еўрапейскіх гарадах, я ў першую чаргу звяртаю ўвагу на арыгінальныя ў плане дызайну месцы. Заўсёды хацелася зрабіць штосьці незвычайнае ў Віцебску. Ідэй процьма. І вось, нарэшце, з'явілася магчымасць». Дарэчы, некаторыя цікавыя прадметы, бачыла на свае вочы, ужо з'явіліся ў дворыку «Арт-прасторы».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з асабістага архіва Яўгена КУТАРКІНА.

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации
1	д. Медухово, ул. Солнечная, д. 5, У-1, кадастровый номер 623280807401000107	0,1500 га	Подъездные пути удовлетворительные	3408,00	682,00	1476,67
2	д. Родевичи, ул. Школьная, д. 14Б, кадастровый номер 623280810601000074	0,1845 га	Подъездные пути удовлетворительные	3200,00	640,00	1435,73
3	д. Беланы, уч. № 4, кадастровый номер 623280800801000046		Подъездные пути удовлетворительные	2071,94	414,39	1445,08

Аукцион проводится 26.08.2016 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского сельского исполнительного комитета.

Документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **до 23 августа 2016 года** (последний день подачи документов – **22.08.2016 г. до 17.00**) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области.

Задаток перечисляется на р/с №3600619021108 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, МФО 153001795, ОКПО 04431493, УНН 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Контактные телефоны: 801774 56 4 36, 56 4 98.

Ликвидатор объявляет о проведении 07.09.2016 г. в 14.00 по адресу: Минск, Беды, 29-1Н торгов по продаже имущества ООО «Аист-Импорт»:

1) автомобиль IVECO AS440 S50 AS STRALIS E4,
гос. № АІ 6106-7, vin WJMM1VUH40C185076, 2007 г.в., начальная цена – 8 000 руб. без НДС.

2) автомобиль MAN TGA 18/430, 2005 г.в.,
гос. № АМ 2041-7, vin WMAH06ZZ36M431038, начальная цена – 2 600 руб. без НДС.

Начальная стоимость определена на основании заключений об оценке рыночной стоимости № 6/2016/1 и 6/2016/2 от 04.07.2016 г. соответственно. Транспортные средства в нерабочем состоянии. Имеется запрет ГТК на снятие транспортных средств с учета в ГАИ. Шаг торгов – 5%.

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012015722010 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 115, г. Минск, Кропоткина, 91, код 749. УНП 191228804. **Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33 в срок по 04.09.2016 г.**

По усмотрению ликвидатора оплата лотов может производиться в пользу третьих лиц на основании соответствующих договоров.

Справки по тел. +375296080101.

■ На скрыжаваннях лёсу

КАЛІ ВЫ ПОБАЧ, ПРАБЛЕМ НІБЫТА І НЯМА

Дзякуючы педагогам школа-інтэрнат стала важным і светлым перыядам у жыцці цэлага пакалення

У зале музея.

Пасля вызвалення сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у мястэчку Узда, што на Міншчыне, 15 ліпеня 1944 года быў створаны спецыяльны дзіцячы дом для дзяцей палеглых воінаў і партызанаў. Сюды звозілі сірот з усіх куткоў Савецкага Саюза. Многія з іх перажылі шмат жахаў і пакут ваеннага ліхалецця, прайшлі канцэнтрацыйныя лагеры, гестапа. І толькі тут, у дзіцячым доме, іх заледзянелыя душы змаглі адагрэць выхавальнікі сваёй цеплынёй, клопатам, бясконцым цярпеннем. Не выпадкова дзеці іх успрымалі як родных бацькоў. Многія з малых не памяталі, хто яны, і бралі прозвішчы сваіх настаўнікаў. А першым дырэктарам стаў Пётр Васільевіч Козел. З фотаздымка, што ў школьным музеі, глядзіць чалавек з глыбокімі вачыма, якія літаральна выпраменьваюць дабрыню і святло. Тут жа і пасведчанне байца партызанскага атрада імя Катоўскага брыгады Варашылава, якая дзейнічала на тэрыторыі Уздзенскага, Дзяржынскага і Нясвіжскага раёнаў.

— Работа па стварэнні музея пачалася ў 1994 годзе, а ў 2009-м адкрыта новая экспазіцыя. Кожны экспанат адлюстроўвае не толькі гісторыю школы, але і цэлую пасляваенную эпоху да нашых дзён, — расказала настаўніца, а па сумяшчальніцтве **загадчыца музея Іна ЗАХАРАВА**. — У нас шмат унікальных прадметаў. Вось кніга загадаў па Уздзенскім дзіцячым доме, датаваная 1944 годам. Кранаюць да слёз запісы аб тым, як заахвочвалі дзяцей у тыя далёкія часы на выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны. Ім дарылі адрэзы тканіны для пашыву прыгожай сукенкі, кашулі, а яшчэ 150 г пернікаў і 100 г цукерак. А вось гэты сшытак быў знойдзены ў нямецкай камендатуры мястэчка. У пасляваенныя гады папера была вялікім дэфіцытам. Таму яго не выкінулі, а выкарысталі як кнігу руху дзяцей па Уздзенскім дзіцячым доме ў 1944 годзе. Тут вёўся спіс выхаванцаў, якія першымі паступалі ва ўстанову. За кожным прозвішчам — глыбокая трагедыя.

...Валянціна Война рана засталася сіратой. У 1937 годзе бацька дзяўчынкі быў арыштаваны і расстраляны, маці памерла пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці. Унукі засталіся з бабуляй. Афіцэр НКУС, пашкадаваўшы малых, параіў старой раскідаць іх у чужыя сем'і па розных населеных пунктах. Валя апынулася ў вёсцы Астравок, якая ў гады вайны была спалена. Цудам дзяўчынцы ўдалося ўцячы ў лес. Дачакаўшыся, пакуль карнікі пакінулі вёску, яна выйшла на дарогу....

Ва Уздзенскім дзіцячым доме яна была старанная вучаніцай, закончыла Пінскае педагагічнае вучылішча, а затым — філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Заслужаная настаўніца БССР вучыла і дачку Васіля Емяльянавіча Куцанава, які ўзначальваў дзіцячы дом у 1944—1947 гадах, — Ларысу. Дзяўчына стала жонкай вядомага кампазітара, народнага артыста СССР Яўгена Глебава. У 2010 годзе Ларыса Васільеўна выдала кнігу «Яўген Глебаў. Лёсу сярэбраныя струны». Адзін з раздзелаў прысвечаны дзіцячаму дому.

Пахвальная грамата 1939 года выхаванкі дзіцячага дома Марыі Жыгачовай.

Валянцін Холад — Герой Савецкага Саюза, камандзір атамнай падводнай лодкі, контр-адмірал жыве ў Санкт-Пецярбургу. На грудзях яго жонкі Жанны Мікалаеўны, што глядзіць з фотаздымка, незвычайны медаль. Такую самаробную ўзнагароду «зацвердзілі» афіцэры-падводнікі для сваіх верных спадарожніц у знак удзячнасці за тое, што пераносяць з імі ўсе цяжкасці службы...

— Другі перыяд установы пачаўся ў 1959 годзе, калі на базе спецыяльнага дзіцячага дома была створана сярэдняя агульнаадукацыйная школа-інтэрнат. Дырэктарам яе прызначылі Мікалая Бардовіча. Мікалай Маісеевіч стаў легендай Мінскай вобласці. Менавіта дзякуючы яму тут быў створаны цудоўны калектыў педагогаў-аднадумцаў, якія давалі вучням вельмі моцныя веды, — працягвае Іна Захарава. — Гэтыя людзі замянілі дзецям бацькоў, добрых, мудрых, клапатлівых, і далі кожнаму пуцёўку ў дарослае жыццё. Нашы выпускнікі заўсёды паступалі ў самыя прэстыжныя навучальныя ўстановы былога Савецкага Саюза.

У 1993 годзе навучальная ўстанова стала санаторнай школай-інтэрнатам для дзяцей з зон радыяцыйнага забруджвання. Яе ўзначаліла заслужаная настаўніца, выдатніца адукацыі Беларусі Людміла Іванаўна Камашэнкава. Сёння гэта санаторная школа-інтэрнат для дзяцей з саматычнай паталогіяй. Кожную чвэрць тут лечацца і праходзяць аздараўленне 160 хлопчыкаў і дзяўчатак Міншчыны, у тым ліку з няпоўных, малазабяспечаных, неўладкаваных сям'яў, сіроты. Выхаванцы тут папраўляюцца, дужэюць, і, бясспрэчна, выхавальнікі робяць усё неабходнае, каб дзеці развіваліся духоўна і інтэлектуальна, раслі патрыётамі. Да іх наведваюцца курсанты і афіцэры ваеннай акадэміі, ветэраны вайны. Штогод у школе арганізуецца дзень музея, які з нецярпеннем чакаюць вучні, паколькі да іх прыязджаюць супрацоўнікі кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл са сваімі гадаванцамі з паказальнымі выступленнямі. А шэфы з 15-й зенітнай брыгады горада Фаніпаля частуюць усіх ахвотных салдацкай кашай, прыгатаванай у палявой кухні. З задавальненнем выступаюць перад дзіцячай аўдыторыяй зоркі беларускай эстрады. На стэндах музея фотаздымкі «Сяброў», Ірыны Дарафееваў, Сашы Нэма, групы «Да Вінчы», ансамбля «Бяседа».

Ваза «Юбілейная», зробленая выпускнікамі 1971 года, адлюстроўвае дасягненні краіны за 50 гадоў.

Даглядаюць школьнікі і Алею памяці педагогаў. За кожным дрэўцам замацаваны вучні пэўнага класа. Вось дрэва ў памяць настаўніка Адама Якаўлевіча Александровіча. Ён захапляўся краязнаўствам, выхоўваў у дзяцей любоў да роднага краю. На алеі ёсць дрэва і ў гонар сямейнай дынастыі Мірончыкаў — Анатоля Пятровіча і яго жонкі, Леаніды Міхайлаўны. Пра яе нехта з вучняў сказаў: «Калі вы побач з намі, праблем нібыта і няма»...

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by
Фота з архіва музея

■ Чулі?

У МІРЫ ЗНОЙДЗЕНЫ БУДЫНАК, ЯКОГА НЯМА НА КАРТАХ

Фрагменты будынка канца XVI—пачатку XVII стагоддзя былі знойдзены падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі музея «Палацавы комплекс «Мір». Пра ўнікальную знаходку праінфармавалі старшыню Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА.

Уладзімір ГУСАКОЎ знаёміцца з археалагічнымі знаходкамі.

У Карэліцкім раёне побач з Мірскім замкам упершыню праводзяцца археалагічныя пошукі на месцы, дзе калісьці быў размешчаны палац Святаполк-Мірскіх канца XIX стагоддзя. Работы вядуцца пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірыны Ганецкай.

У працэсе раскопак быў выяўлены цэлы шэраг важных археалагічных знаходак. Так, вышэйзгаданага будынка XVI—XVII стагоддзяў няма ні на адной гістарычнай карце. Археолагамі былі знойдзены фрагменты кафлі, чарапіцы, сталовай керамікі, а таксама «цагліна-пальчатка», якая датуецца XVI—XVII стагоддзямі.

Расчышчаны падмурак дома XIX стагоддзя, які належаў домакіраўніку, а таксама лесвіца. Ірына Ганецкая лічыць, што гэтая лесвіца, па ўсёй верагоднасці, знаходзілася ўнутры памяшкання. «Мяркуючы па планах будынка пачатку XX стагоддзя, палац быў крыжападобнай сіметрычнай формы: галоўны корпус выцягнуты, а з двух бакоў — прыбудовы. Дык вось гэтая лесвіца, хутчэй за ўсё, і з'яўляецца часткай адной з іх», — патлумачыла яна. Позні палац Святаполк-Мірскіх вырас, як цяпер высветлілася, на больш старажытным падмурку.

Падчас знаёмства з вынікамі археалагічных раскопак старшыня прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў падкрэсліў важнасць археалагічных работ, што праводзяцца, і іх значэнне для захавання гісторыі і культурнай спадчыны беларускага народа.

Названыя археалагічныя работы з'яўляюцца першым крокам у рэалізацыі Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і музеем «Палацавы комплекс «Мір». Дакумент быў падпісаны ў снежні 2015 года. На цяперашні момант археолагамі вывучана тэрыторыя больш чым у 200 квадратных метраў.

«Замкавы комплекс «Мір»— унікальны помнік нацыянальнай культуры Беларусі. У 2000 годзе Мірскі замак быў уключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Вечны камандантэ ва ўспамінах трох беларусаў

Дзесяць гадоў таму адбыўся першы візіт Уга Чавеса ў Мінск

Апошнім часам Венесуэла ў СМІ выглядае не вельмі прывабна. Але ж так было не заўсёды. Прывабны імідж Венесуэлы ў вялікай ступені ствараў яе харызматычны прэзідэнт Уга-Рафаэль Чавес Фрыяс. Мінулы месяц падарыў абгрунтаваную нагоду згадаць гэтага незабыўнага палітыка і абаяльнага чалавека: 24 ліпеня споўнілася дзесяць год з яго першага візіту ў Беларусь, а 28-га — дзень народзінаў самога камандантэ... Цяпер яму было б шэсцьдзясят два. Якім быў Чавес, расказваюць тры беларусы, якім давялося працаваць у Венесуэле і пашчасціла перасякацца з ім у самых розных абставінах.

Фота Андрэя СМІРНОВА.

Уга Чавес на беларуска-венесуэльскім будаўнічым аб'екце ў горадзе Маракай, штат Арагуа (18 сакавіка 2010 г.).

ЯК ЧАВЕС ПАВІНШАВАЎ ПАСЛА БЕЛАРУСІ З ЮБІЛЕЕМ

Адной з галоўных рысаў Чавеса была непадробная ўважлівасць да людзей, сентыментальны падыход да бяздольных і пазапратакольны — да афіцыйных асоб. У **першага пасла Беларусі ў Венесуэле Валянціна ГУРЫНОВІЧА** (2008—2012 гг.) увогуле склаліся з ім сяброўскія адносіны, якія ішлі на карысць супрацоўніцтву дзвюх краін. Чавес неаднаразова і прылюдна ставіў Гурыновыча ў прыклад міністрам свайго ўрада. Калі Гурыновічу была патрэбная тэрміновая сустрэча з прэзідэнтам Венесуэлы, яе арганізоўвалі за лічаныя гадзіны. Расказвае сам Валянцін Аркадзьевіч:

— Будаўніцтва завода MAZVEN замаруджвалася, шматлікія нарады з венесуэльскім міністрам прамысловасці не рухалі справу наперад. Тады я званю Чавесу і звяртаюся па дапамогу. Ён адказвае: «Чакаю ў Мірафлорэсе апоўначы». Калі я прыехаў у прэзідэнцкі палац, ён яшчэ працаваў з міністрамі. Зрэшты, і мяне прыняў, выслухаў, а потым, у дзве з паловай ночы тэлефануе міністру прамысловасці і кажа: «Тут у мяне беларускі пасол Валянцін, даю табе два тыдні на тое, каб злятаць з ім у Мінск на завод МАЗ». Праз вызначаны час так і адбылося, міністр пабачыў наш завод на свае вочы, натхніўся, і ў рэшце рэшт будаўніцтва MAZVEN паспяхова завяршылася праз паўгода.

Чавес увогуле быў майстрам ламаць пратакол, спазняўся на сустрэчы з дэлегацыямі, у апошнюю хвіліну мяняў маршруты і віды транспарту і г.д. А з прэзідэнцкага палаца іншым разам выязджаў не адзін, а два картэжы...

Чавес таксама неаднаразова тэлефанаваў паслу напрамую. Натуральна, размаўлялі яны праз перакладчыка. Вось кур'ёзная гісторыя аднаго з такіх званкоў. Слова паслу Гурыновічу:

— Геаграфічна мой 60-гадовы юбілей прыпаў на Каракас. З Мінска прыляцелі жонка і малодшая дачка з унучкай. Сядзім, вячэраем... Раптам тэлефонны званок. Хто гэта ў такі час? У Венесуэле працоўны дзень скончыўся, у Беларусі пяць раніцы... Узяў трубку, а ў ёй: «Гэта канцылярыя Палаца Мірафлорэс, з вамі будзе гаварыць прэзідэнт Чавес». А ў мяне перакладчыка побач няма, ад хвалявання сам па-іспанску загаварыў...

Наступным днём у пасольства прывезлі падарунак: бюст Балівара з памятнай гравіроўкай, а таксама віншавальны ліст за подпісам камандантэ. Вельмі цёплыя і пранікнёныя словы. Больш за ўсё Гурыновіча здзівіла страфа з верша нашага песняра Максіма Багдановіча:

— Чавес нярэдка ў публічных выступах цытаваў Балівара, Маркса, Леніна, нават Мао Цзэдуна і Троцкага, а тут... беларускі паэт! Мяне тое віншаванне кранула да глыбіні душы.

ЯК ЧАВЕС НАБЫЎ 804 АЎТОБУСЫ МАЗ

Яшчэ ў камандантэ была такая асаблівасць: падчас гутаркі з аўдыторыяй ён адшукваў кагосьці вачыма і пачынаў знаёміцца. Па-першае, пытаўся, як завуць, адкуль родам, хто па прафесіі, пра жонку і дзетак мог запытаць і гэтак далей. Бывала, што размаўляў твар у твар, мужчын абдымаў па-брацку, дзетак браў на рукі, а жанчын цалаваў. Дарэчы, у Расіі ён перацалаваў увесь хор данскіх казачак.

І з беларусамі падобныя сітуацыі здараліся. Распавядае **Рыгор КАПАЧ, кіраўнік цэнтра па сервісным абслугоўванні і рамонце аўтамабільнай тэхнікі ў горадзе Вікторыя, штат Арагуа:**

— Мая першая сустрэча з Чавесам адбылася ў 2010-м годзе на канвееры па зборцы аўтобусаў МАЗ. Падышоў да мяне, павітаўся, працягнуўшы руку: «Дзесьці я вас бачыў раней?» Я павітаўся і адказаў Чавесу па-іспанску (чым прыемна здзівіў яго): маўляў, іспанскую мову вывучыў за тры гады працы на Кубе, цяпер з'яўляюся дырэктарам аўтобуснага цэха, а пабачыць мяне раней ён мог падчас беларускай выставы...

Кароткая сустрэча ў Капача пакінула ўражанне, што Чавес маштабна мысліць, рашэнні прымае неадваротныя і не марудзіць з іх выкананнем. Прыкладам таму — набыццё Венесуэлай нашых 804 аўтобусаў МАЗ. Паміж гутаркай на канвееры і прыняццем рашэння прайшлі хвіліны. Умовы кантракта ўзгадняліся ўсяго два месяцы. Яўчэ паўгода — і першая партыя тэхнікі ўжо плыве праз Атлантыку. На пытанне, што падштурхнула Чавеса да набыцця аўтобусаў, Рыгор Эдвардавіч расказаў наступнае:

— На канвееры і на выстаўцы шмат пытанняў ён не задаваў, хутчэй за ўсё, на завод ехаў ужо з намерам набыць тое-сёе з аўтатэхнікі. Але ж, праехаўшы пасажырам у аўтобусе 256-й мадэлі, які падвозіў дэлегацыю да цэха, запытаўся: ці здолее гэты аўтобус працаваць у Венесуэле? Мы адказалі, што так, здолее, калі дапрацаваць, «трапікалізаваць».

У той памятны дзень на МАЗе таксама не абышлося без фірменных пацалункаў-абдымкаў Чавеса. Капач успамінае:

— Напрыканцы гутаркі ён запытаўся: ці ведаю пра прыгажосць венесуэлак? Так, камандантэ, яны ўвесь час перамагаюць на сусветных конкурсах! Чавес рассмяяўся, падгроб да сябе адну з працаўніц канвеера і, пацалаваўшы яе ў шчаку, абвясціў: «Беларускі таксама прыгожыя!»

ЧАВЕС З АДЛЕГЛАСЦІ ВЫПРАСТАНАЙ РУКІ

Вышэй я распавёў пра сустрэчы з Чавесам са слоў маіх землякоў, а цяпер прывяду асабістыя ўражанні. Ды не толькі пра яго самога, але і пра абставіны сустрэчы.

Будаўнічая пляцоўка ў горадзе Маракай 18 сакавіка 2010 года. Прэзідэнты Чавес і Лукашэнка павінны прыляцець на верталёце, але ж прыехалі на джыпе, прычым са спазненнем гадзіны на тры.

Пра набліжэнне картэжа сведчыў нарастаючы людскі роў — нібыта з бейсбольнага стадыёна UCV падчас фіналу «Ільвы Каракаса» — «Магеланы»... Джып суправаджаў шматлікі натоўп экзальтаваных чавістаў, якія беглі побач з аўтамабілем, нібыта неслі яго на сваіх руках. Спачатку натоўп прарваў ачапленне нацыянальных гвардзейцаў, за імгненне знёсшы вароты з сеткі рабіцы. Затым людзі, у якіх не было аніякай акрэдытацыі, але былі ручаі слёз ад шчасця на тварах, пабеглі па тэрыторыі будоўлі, узнімаючы пыл да нябёсаў.

Я таксама, па шчыкалатку ў глеі, бег за джыпам, балазе ягоная хуткасць не перавышала 10 км за гадзіну. Адна немаладая жанчына, што стамілася бегчы, сунула мне аркуш паперы ў форме скрутка: «Сеньёр, сеньёр, перадайце мой ліст Чавесу, Богам прашу!» Другі аркуш працягнуў стомлены дзядок з тым жа намерам. Пазней я прачытаў абодва пасланні: у адным была вершаваная паэма ў гонар Чавеса, у другім — просьба дапамагчы з крэсламі для каледжа...

Зрэшты, галоўная машына картэжа даехала да велічэзнага нацягнутага брызента памерам з тэнісны корт, дзе лідараў дзвюх краін чакалі акрэдытаваныя VIP-госці, гарэлі сафіты ды завіхаліся тэлевізіёншчыкі. Пунсовы абрус на стале прэзідыума нагадваў гіганцкі рэвалюцыйны сцяг. Адзін з тэлеаператараў балансаваў на версе кузава 40-тоннага БелАЗа, за агароджай з рабіцы віравалі тысячы гледачоў з партрэтамі камандантэ, дзецьмі і нават немаўлятамі на руках. Усе крычалі або свісталі. У каго рукі былі не занятыя, раскачвалі агароджу нібыта саламяную.

У прэзідыум, за чырвоны абрус абодва прэзідэнты так і не селі, паехалі ў поле працягваць перамовы... Чавес увогуле быў майстрам ламаць пратакол, спазняўся на сустрэчы з дэлегацыямі, у апошнюю хвіліну мяняў маршруты і віды транспарту і г.д. А з прэзідэнцкага палаца іншым разам выязджаў не адзін, а два картэжы... Так ахова Чавеса бараніла свайго шэфа ад магчымых замахаў на ягонае жыццё. Тым больш што спроб было нямала. Адзінае, ад чаго не бараніліся камандантэ і ягоная ахова, — гэта натоўп прыхільнікаў Чавеса. Мяркуйце самі: які б наёмны забойца адважыўся стрэліць ва ўлюбёнца мільёнаў сярод тысячнага натоўпу фанатыкаў?

Рыгор КАПАЧ гутарыў з Чавесам двойчы, але пра моднае цяпер сэлфі так і не паклапаціўся...

...Апынуўшыся ад яго на адлегласці выцягнутай рукі, я паядаў камандантэ вачыма, імкнучыся запомніць нюансы знешнасці, голасу, вопраткі, манераў... Ён быў так блізка, што нават пігментная пляма на левай скроні трапіла ў аб'ектыў. Усе бачылі ягоную папілому на правай бачыне лба, а вось пляму — бадай, толькі родныя.

Яшчэ здзівіла абсалютная адсутнасць сівых валасоў. Думаю, у яго не было часу фарбаваць іх, бо Чавес спаў не больш за чатыры гадзіны ў суткі. За працоўны дзень, па ягоных жа словах, выпіваў два тэрмасы кавы. Тут, хутчэй, генетыка, моц трох рас — еўрапейскай, афраамерыканскай і карэннай індзейскай.

Зубы, праўда, расчаравалі: месцамі рэдкія, з заўважнымі шчылінамі. Але ж ягоная суперабаяльная ўсмешка нібыта хавала гэты недахоп. Такім я яго і трымаю ў памяці — звычайным ды смяротным, як любы з нас, і вялікім ды бессмяротным, якіх у гісторыі чалавецтва адзінкі. Нездарма ж чавісты завуць яго Вечны Камандантэ.

Андрэй СМІРНОЎ,
прэс-сакратар
ЗАТ «Белзамежбуд».

Бюст Балівара — падарунак Чавеса паслу Гурыновічу.

Miraflores, 06 de mayo de 2010

Valentin Arkadjevich Gurinovich
Embajador Extraordinario y Plenipotenciario de la República de Belarús en la República Bolivariana de Venezuela

Querido Valentín:

En el comienzo de un nuevo año de vida, mi querido Valentín, quiero saludarte en nombre de todo lo que une a nuestros dos Pueblos: en nombre del vínculo fraternal que hoy enlaza a nuestras dos Patrias.

En ti reconozco al servidor apasionado de la dignísima y heroica Bielorrusia: de la Bielorrusia que amamos y que ya está sembrada en el corazón del pueblo de Venezuela. Pero, al mismo tiempo, te sé y te siento como un verdadero amigo de nuestra causa.

Quiero recordar contigo, amigo mío, los versos de aquel inmenso bardo bielorruso llamado Maskim Bogdanovich:
La canción estalla y mana a borbotones en el gran mundo, sin cadenas, libre.
¿Quién la escuchara?
Sólo el poeta, quizás.

Hoy ya no sólo la escucha el poeta y estoy seguro que Bogdanovich estaría de acuerdo: la canción ya la están escuchando y cantando Bielorrusia y Venezuela en nuestra batalla por el gran mundo, sin cadenas, libre, por el gran mundo donde caben muchos mundos.

Recibe la más afectuosa palabra de felicitación junto con un abrazo pleno de fervor revolucionario.

¡¡Feliz Cumpleaños, amiga mía!!

Fraternalmente,

Hugo Chávez Frías

Віншавальны тэкст паслу Беларусі са страфой Максіма Багдановіча і аўтографам Чавеса: «Дарагі Валянцін... з Днём нараджэння, мой сябра!»

■ Ёсць пытанне

ПРЭПАРАТ АДЗІН, А ЦАНЫ — ДЗВЕ?

«Мой бацька — інвалід 1 групы. Кожны месяц мы купляем для яго даволі дарагое лякарства (алзепіл). Каб хоць неяк сэканоміць, адсочваем па інтэрнэце кошт прэпарата ў аптэках Мінска і набываем там, дзе ён таннейшы. Аднак на гэты раз у аптэцы, куды я прыехала, мне сказалі, што прэпарат ёсць. 691 000 і 715 000 рублёў (у старых цэнах). А прадаць мне могуць толькі за 715 000, спасылаючыся на нейкую пастанову Міністэрства аховы здароўя. Адкажыце, калі ласка, што гэта за дакумент і чаму хворы чалавек не мае права набыць тое, што ён хоча?

В. Кулінковіч, *г. Мінск*».

Патлумачыла **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла РЭУЦКАЯ**. 1 ліпеня набыў моц Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №288 («Аб унясенні змяненняў...»), згодна з якім новы парадак фарміравання коштаў на лекі паспрыяў зніжэнню кошту на большасць з іх у аптэчнай сетцы. Разам з тым, сёння ў нас ёсць факты няправільнага прымянення фармацэўтычнымі работнікамі аптэк нормы Належнай аптэчнай практыкі — «пры наяўнасці ў аптэках адной і той жа гандлёвай назвы лекавага сродку яго рэалізацыя ажыццяўляецца ў парадку паступлення з улікам астаткавага тэрміну прыдатнасці». Устаноўлены выпадкі, калі на партале tabletka.by і іншых аптэкі размяшчаюць звесткі аб адначасовай рэалізацыі аднаго і таго ж сродку па розных коштах. На практыцы пры зваротах грамадзян у такія аптэкі (як у дадзеным выпадку) фармацэўтычны работнік адмаўляўся рэалізоўваць лекі па больш нізкім кошце, спасылаючыся на пункт 63 Належнай аптэчнай практыкі.

Аднак, згодна з гэтым жа заканадаўствам, адначасовая рэалізацыя адной і той жа гандлёвай назвы лекавага сродку па дзвюх ці некалькіх розных цэнах у адной аптэцы не дапускаецца. Недапушчальнай таксама з'яўляецца сітуацыя, пры якой спачатку даецца інфармацыя аб наяўнасці канкрэтных гандлёвых назваў адначасова па розных коштах, а пасля грамадзянам адмаўляюць у рэалізацыі па больш нізкім.

Для прадухілення новых падобных выпадкаў няправільнага разумення нормаў заканадаўства кіраўнікам юрыдычных асоб і спецыялістам, адказным за фармацэўтычную дзейнасць, даручана не дапускаць наяўнасці ў аптэцы адной і той жа назвы прэпарата адначасова па розных коштах. У выпадку паступлення новай партыі прэпарата, рознічны кошт на які ніжэй за той, што ёсць у рэалізацыі, варта прыняць меры, скіраваныя на зніжэнне, напрыклад, гандлёвай надбаўкі на тую партыю, што паступіла раней.

■ Рабі, як мы

Прыкусіце языкі: не ўжывайце мацюкі!

...Некалі Сакрат казаў: «Загавары са мной, каб я цябе ўбачыў».

Культуру мовы і сапраўды нельга аддзяліць ад агульнай культуры чалавека.

У нашым раёне дзейнічае акцыя «Скажам брыдкаслоўю НЕ!» Ініцыятарам яе тры гады таму стаў прыход Свята-Узнясенскай царквы. Тады пратаіерэй Мікалай і я, яго памочнік, сталі выступаць з лекцыямі на гэтую тэму. З часам да нас пачалі далучацца прадстаўнікі БРСМ, міліцыі, камісіі па справах непаўналетніх, раённай бальніцы... Сярод слухачоў былі вучні старэйшых класаў... Але ж аднойчы, пасля такой вось сустрэчы, да мяне падышоў юнак і сказаў, што справа, якую мы робім, безумоўна, патрэбная, але не толькі моладзі. «Добра было б, каб такія лекцыі, такія размовы, — прапанаваў ён, — вы праводзілі яшчэ і з... бацькамі». Прычым хлопец гаварыў пра гэта з такім болем, што няцяжка было зразумець, як жа «дастала» яго атмасфера брыдкаслоўя ў сям'і!

З таго дня мы вырашылі пашырыць практыку падобных гутарак яшчэ і на працоўныя калектывы. Прапанову гэтую падтрымалі ў раённым выканаўчым камітэце. На адной з нарад у прысутнасці кіраўнікоў раённых прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў нам далі магчымасць патлумачыць, якую разбуральную сілу нясе брыдкаслоўе, як уплывае на псіхічнае і фізічнае здароўе людзей.

І працяг чакаць сябе не прымусіў: у хуткім часе шчырыя размовы з дарослымі адбыліся ў раённым спажывецкім таварыстве з загадчыкамі крамаў, кавярняў і сталовых, у раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях... Ёсць запрашэнні ад лясгаса і камунальнікаў.

Але ж брыдкаслоўе — з'ява вельмі распаўсюджаная, і не толькі ў нас. А таму і змагацца з ёй трэба разам, на ўсіх франтах. Магчыма, нашу ініцыятыву, наш досвед падтрымаюць іншыя?

Валерый ГАЎРЫШ,

г. Чавусы

■ Наша марка

«ХАРОШКІ» — ЯНЫ І Ў ПУСТЫНІ «ХАРОШКІ»!

...Традыцыя: у войска нас праводзілі ўсёй акругай, клуб набіўся бітком. І было там, здаецца, усё: і шчырыя пажаданні, і вясёлыя конкурсы з армейскага быту, і адмысловы канцэрт, і дзівосныя, дарагія падарункі. Кожны з нас, прызыўнікоў, атрымаў тады па невялічкім шаўковым мяшэчку са жменькай роднай зямлі. Апроч таго, нашы дзяўчаты па прапанове класнай кіраўніцы Вольгі Іванаўны вышылі ўсім прыгожыя сурвэткі з сардэчным надпісам: «Помні аднакласніц. Вясна, 1988 год».

Акурат тады, вясной 1988-га, і пачалася мая армейская служба.

Праходзіла яна ў далёкім Туркестане. Там на першым ранішнім аглядзе, які праводзіў старшына роты, я з хваляваннем дастаў асабістыя рэчы, сярод якіх былі тая вышытая сурвэтка і жменька роднай зямлі. За тое, што трымаю іх, нашу пры сабе, чакаў вымовы, а выйшла ўсё наадварот. Старшы прапаршчык Ягнёнкаў — высокі, статны, з алтайскіх казакоў — моцна паціснуў мне руку, сказаў: «Насі гэта годна!..»

Такім чынам падарункі маіх аднакласніц два гады грэлі маё салдацкае сэрца.

У памяці да скону і яшчэ адна знакавая падзея, якая дадала мне гонару за маю Беларусь, маіх землякоў.

...Свабодных месцаў у Доме афіцэраў тады не было. Ад моцнай спёкі (пад +50!) не ратавалі нават тоўстыя мураваныя сцены.

А на сцэне тым часам пачыналася дзейства: да нас завіталі «Харошкі» — сюды, лічы, у самае сэрца пустыні Каракум!

Напярэдадні хлопцы-саслужыўцы розных нацыянальнасцяў з цікавасцю распытвалі нас, беларусаў, хто ж такія гэтыя «Харошкі»? А што мы маглі адказаць, калі і самі бачылі іх хіба па тэлевізары. Таму і выкручваліся як хто мог: тлумачылі, што гэта танцавальны ансамбль, што выступае ён у фальклорным жанры, што само слова «Харошкі» азначае, што гэта гурт вельмі харошых, вясёлых людзей...

Тое, што яны, гэтыя харошыя і вясёлыя людзі, рабілі на сцэне ў паўнюткай і, што там казаць, вельмі душнай зале Дома афіцэраў, захапляла ўсіх з першых акордаў, з першых танцавальных крокаў і трымала ўжо да самага канца выступлення! Гарэзлівая полька, жартаўлівы кракавяк, «Лявоніха» — усё гэта было такім родным і блізкім!.. Прычым, як згледзеў, не толькі для мяне — для ўсіх маіх таварышаў. Хлопцы не маглі стрымаць сваіх пачуццяў: кожны нумар прымаўся на «ўра!», гэта значыць, на «біс»! «Вось гэта беларусы. Вось гэта харошкі!» — узбекі, казахі, туркмены ўзрушана пляскалі нас (?!) па плячах, моцна ціснулі рукі, атрымліваючы сапраўдную асалоду ад выступлення нашых землякоў. Цудоўная харэаграфія, прыгожыя касцюмы, самабытная нацыянальная музыка, гумар і найвялікшы ўзровень майстэрства!

Гучнымі апладысментамі, ад якіх, здаецца, магла абрынуцца столь, мы яшчэ доўга трымалі артыстаў на сцэне. І яна тады падалася мне сапраўдным астраўком, аазісам роднай беларускай зямлі сярод спякотнай далёкай пустыні.

...Праляцелі гады, але ж кожны раз, калі выступаюць «Харошкі», я з душэўнай цеплынёй успамінаю той канцэрт у туркменскім горадзе Чарджоу, які пакарыў сэрцы маіх армейскіх таварышаў амаль з усіх рэспублік былога Савецкага Саюза. А таму праз любімую «Звязду» хачу шчыра павіншаваць мастацкага кіраўніка «Харошак» Валянціну Іванаўну Гаявую з яе прыгожым юбілеем і сказаць, што ваша праца сапраўды нясе людзям радасць!

Генадзь МІШЧУК,

в. Вотчына, Маларыцкі раён

■ Рэзананс

«І НАЙПЕРШАЕ ІМЯ ТУТ ЯНКА!»

Ці ўсё ж Францыск?

У нумары «Звязды» ад 28 ліпеня прачытаў, што ў хуткім часе наш аэрапорт перастане быць безыменным, што ён, як і многія іншыя аэрапорты ў іншых краінах, атрымае імя.

Згодны: Францыск Скарына — вельмі вядомы чалавек і паважаны, прычым — ва ўсім свеце. Я вельмі ганаруся, што ён беларус. Але ж у нас, калі не блытаю, ёсць ордэн і медаль імя Скарыны, ёсць Нацыянальная бібліятэка, помнікі, вуліцы (напэўна ж, не толькі ў сталіцы?), ёсць Таварыства беларускай мовы, розныя прэміі і г.д.

Як шчыры аматар айчыннай літаратуры і паэзіі, я даўно пісаў, што нашаму Нацыянальнаму аэрапорту добра было б надаць імя вялікага Янкі Купалы. Ён — пясняр, якіх мала, і шчыры беларус — гэтага, безумоўна ж, заслугоўвае! Ды і назва як загучыць: «Аэрапорт імя Янкі Купалы»... Што адпавядае нашаму часу, больш сугучна нашаму жыццю, што аддае даніну павагі савецкаму перыяду, у якім жыў, тварыў і загінуў вялікі пясняр, жылі нашы дзяды і бацькі, і ў якім, нягледзячы на сур'ёзныя памылкі, выросла цэлая плеяда слынных паэтаў і пісьменнікаў, якіх трэба чытаць, якімі трэба ганарыцца. І найпершае імя тут — Янка...

А зрэшты, добра было б, каб па такіх пытаннях маглі выказацца людзі. І каб да іх меркаванняў нехта прыслухаўся.

Уладзімір ГОЛУБЕЎ,
чытач газеты з 1957 года,
г. Мінск.

P.S. *Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць «Звязду», яе супрацоўнікаў і ўсіх чытачоў з прыгожай датай — з 99-годдзем, якое святкуецца 9 жніўня, шчыра пажадаць ёй святліць далей, святліць сама мала столькі ж!*

Што для гэтага трэба? Я думаю так: берагчы сваіх старэйшых чытачоў (бо ў іх сіла) і паважаць новых, маладых, бо ў іх далейшы лёс — і газеты, і мовы

■ Весткі з месцаў

Адпачынак, які ўражвае

Летнія канікулы
яшчэ ў разгары,
і нашы вучні праводзяць
іх, зразумела ж, па-рознаму.
Адны адпачываюць, а некаторыя вырашылі актыўна папрацаваць.

Летні лагер працы і адпачынку «Факел» — гэта месца і час вольных зносінаў з сябрамі і педагогамі, якія разам з дзецьмі ўдзельнічаюць у розных праектах, не патрабуюць ад іх невыканальнага і не ставяць адзнак. «Разам працуем — разам адпачываем» — вось так сцісла можна ахарактарызаваць дзейнасць лагера. Асноўны накірунак яго праграмы — краязнаўства. Вучні разам з педагогамі рэалізавалі праект «Навагрудак — мая малая Радзіма», і дапамагала ў гэтым цеснае супрацоўніцтва з работнікамі краязнаўчага музея. Разам з імі мы зноў і зноў ішлі па знаёмых сцежках шляхам пазнання гісторыі роднай зямлі.

А яшчэ ў нашым горадзе шмат месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Адно з іх — Музей яўрэйскага супраціўлення, які знаходзіцца на тэрыторыі былога ваяводскага суда,

дзе ў 1942 — 1943 г.г. было яўрэйскае гета. Пасля наведвання экспазіцыі ўзнікае шмат пытанняў, і на кожнае з іх мы паспрабуем знайсці адказ.

Ніна ШАФАР,
настаўніца рускай мовы і літаратуры,
г. Навагрудак

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает,
что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»
12 августа 2016 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня
1. О приобретении акций ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 05 августа 2016 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 06 августа по 10 августа 2016 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 10 августа 2016 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ПРИГЛАШЕНИЕ

Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»

ПРОВОДИТ АУКЦИОН №107 ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО НЕЖИЛОГО ПОМЕЩЕНИЯ СРОКОМ НА ТРИ ГОДА

	Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения	Площадь, м²	Начальная цена продажи до деноминации	Начальная цена продажи после деноминации
г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом. 3				
1	Изолированное нежилое помещение № 13 на 4 этаже в здании СОЦ «Олимп» (под офис)	21,1	717 400	71,74

Аукцион состоится «08» сентября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «07» сентября 2016 года до 17.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11. Интернет: **www.dvs.by.**

Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

УНП 101099370

РУП «Белпочта»

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

для выполнения проектно-изыскательских работ по объекту «Текущий ремонт отделения почтовой связи №6 по ул. Маяковского, 8 в г. Минске».

Процедура переговоров состоится «09» августа 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

Страховой полис универсальный серии ПЕ № 0131801; по добровольному страхованию серии ПУ № 0031546; по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА №0305726, № 0468614–615; 0567434; 0576881; 0576891–894 (4 шт), 0585519, 0585523, 0585525, 0585558, 0639496, 0639559, 0729649, 0067650, 0368536, 0369740, 0368607, 0753193; карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 08807338, 12319473; по обязательному страхованию ГО владельцев ТС на территории РБ серии ВС № 4876438; квитанция о приеме денежных средств формы 1СУ серии КС № 4103626, 3605303 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

